**АДУКАЦЫЙНЫ СТАНДАРТ**
**ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ**

---

# ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ
# ПЕРШАЯ СТУПЕНЬ

**Спецыяльнасць** 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках)
**Кваліфікацыі** залежаць ад напрамку спецыяльнасці.

# ВЫСШЕЕ ОБРАЗОВАНИЕ
# ПЕРВАЯ СТУПЕНЬ

**Специальность** 1-21 05 01 Белорусская филология (по направлениям)
**Квалификации** зависят от направления специальности.

# HIGHER EDUCATION
# FIRST STAGE

**Speciality** 1-21 05 01 Belarusian Philology (majors in)
**Qualifications** is determined by the major.

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Мінск

УДК 811.161.3:378.016(083.74)+821.161.3.09:378.016(083.74)

Ключавыя словы: вышэйшая адукацыя, першая ступень, заліковая адзінка, выніковая атэстацыя, якасць вышэйшай адукацыі, кампетэнцыя, навыкі, прафесійная дзейнасць, забеспячэнне якасці, інтэграваная адукацыйная праграма, самастойная работа, спецыяліст з вышэйшай адукацыяй, тыпавы вучэбны план па спецыяльнасці, вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, патрабаванні, уменні, кампетэнцыі, беларуская філалогія, філолаг, выкладчык беларускай мовы і літаратуры.

## Прадмова

РАСПРАЦАВАНЫ Беларускім дзяржаўным універсітэтам

ЗАЦВЕРДЖАНЫ І ЎВЕДЗЕНЫ Ў ДЗЕЯННЕ Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.08.2013г. №88

Дадзены адукацыйны стандарт не можа быць размножаны і распаўсюджаны без дазволу Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Выдадзены на беларускай мове

# Змест

**1 Галіна прымянення ........ 4**
**2 Нарматыўныя спасылкі........ 5**
**3 Асноўныя тэрміны і азначэнні........ 5**
**4 Агульныя палажэнні........ 5**
4.1 Агульная характарыстыка спецыяльнасці........ 6
4.2 Патрабаванні да ўзроўню адукацыі асоб, якія паступаюць для атрымання вышэйшай адукацыі I ступені........ 6
4.3 Агульныя мэты падрыхтоўкі спецыяліста........ 6
4.4 Формы атрымання вышэйшай адукацыі I ступені........ 6
4.5 Тэрміны атрымання вышэйшай адукацыі I ступені........ 6
**5 Характарыстыка прафесійнай дзейнасці спецыяліста........ 7**
5.1 Сфера прафесійнай дзейнасці спецыяліста........ 7
5.2 Аб'екты прафесійнай дзейнасці спецыяліста........ 7
5.3 Віды прафесійнай дзейнасці спецыяліста........ 7
5.4 Задачы прафесійнай дзейнасці спецыяліста........ 7
5.5 Магчымасці працягу адукацыі спецыяліста........ 7
**6 Патрабаванні да кампетэнтнасці спецыяліста........ 8**
6.1 Склад кампетэнцый спецыяліста........ 8
6.2 Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый спецыяліста........ 8
6.3 Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый спецыяліста........ 8
6.4 Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый спецыяліста........ 8
**7 Патрабаванні да вучэбна-праграмнай дакументацыі........ 9**
7.1 Склад вучэбна-праграмнай дакументацыі........ 9
7.2 Патрабаванні да распрацоўкі вучэбна-праграмнай дакументацыі........ 9
7.3 Патрабаванні да стварэння графіка адукацыйнага працэсу........ 10
7.4 Патрабаванні да структуры тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці)........ 10
7.5 Патрабаванні да абавязковага мінімуму зместу вучэбных праграм і кампетэнцый па вучэбных дысцыплінах........ 14
7.6 Патрабаванні да зместу і арганізацыі практык........ 28
**8 Патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу........ 29**
8.1 Патрабаванні да кадравага забеспячэння адукацыйнага працэсу........ 29
8.2 Патрабаванні да матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння адукацыйнага працэсу........ 29
8.3 Патрабаванні да навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу........ 29
8.4 Патрабаванні да арганізацыі самастойнай работы студэнтаў........ 29
8.5 Патрабаванні да арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы........ 29
8.6 Агульныя патрабаванні да форм і сродкаў дыягностыкі кампетэнцый........ 30
***9 Патрабаванні да выніковай атэстацыі........ 31***
9.1 Агульныя патрабаванні........ 31
9.2 Патрабаванні да дзяржаўнага экзамену........ 31
9.3 Патрабаванні да дыпломнай работы........ 31
**Дадатак Бібліяграфія** 32

# АДУКАЦЫЙНЫ СТАНДАРТ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ. ПЕРШАЯ СТУПЕНЬ

**Спецыяльнасць** 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках)
**Напрамак спецыяльнасці** 1-21 05 01-01 Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)
**Кваліфікацыя** Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры. Літаратурна-рэдакцыйны супрацоўнік
**Напрамак спецыяльнасці** 1-21 05 01-02 Беларуская філалогія (камп'ютарнае забеспячэнне)
**Кваліфікацыя** Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры. Спецыяліст па камп'ютарнай філалогіі
**Напрамак спецыяльнасці** 1-21 05 01-03 Беларуская філалогія (дзелавая камунікацыя)
**Кваліфікацыя** Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры. Спецыяліст па дзелавой камунікацыі.

ВЫСШЕЕ ОБРАЗОВАНИЕ. ПЕРВАЯ СТУПЕНЬ

**Специальность** 1-21 05 01 Белорусская филология (по направлениям)
**Направление специальности** 1-21 05 01-01 Белорусская филология (литературно-редакционная деятельность)
**Квалификация** Филолог. Преподаватель белорусского языка и литературы. Литературно-редакционный сотрудник
**Направление специальности** 1-21 05 01-02 Белорусская филология (компьютерное обеспечение)
**Квалификация** Филолог. Преподаватель белорусского языка и литературы. Специалист по компьютерной филологии
**Направление специальности** 1-21 05 01-03 Белорусская филология (деловая коммуникация)
**Квалификация** Филолог. Преподаватель белорусского языка и литературы. Специалист по деловой коммуникации

HIGHER EDUCATION. FIRST STAGE

**Speciality** 1-21 05 01 Belarusian Philology (majors in)
**Major in** 1-21 05 01-01 Belarusian Philology (Literary and Editorial Activity)
**Qualification** Philologist. Teacher of the Belarusian Language and Literature. Literary and Editorial Specialist
**Major in** 1-21 05 01-02 Belarusian Philology (Computer Support)
**Qualification** Philologist. Teacher of the Belarusian Language and Literature. Specialist in Computer Philology
**Major in** 1-21 05 01-03 Belarusian philology (Business Communication)
**Qualification** Philologist. Teacher of the Belarusian Language and Literature. Specialist in Business Communication.

---

**Дата ўвядзення 2013-09-01**

## 1 Галіна прымянення

Стандарт выкарыстоўваецца падчас распрацоўкі вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, і адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі I ступені, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй і інтэграванай з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасці 1-21 05 01 "Беларуская філалогія (па напрамках)" (далей, калі не вызначана іншае – адукацыйныя праграмы

па спецыяльнасці 1-21 05 01 "Беларуская філалогія (па напрамках)"), вучэбна-метадычнай дакументацыі, вучэбных выданняў, інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў.

Стандарт абавязковы для выкарыстання ва ўсіх установах вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку па адукацыйных праграмах па спецыяльнасці 1-21 05 01 "Беларуская філалогія (па напрамках)".

## 2 Нарматыўныя спасылкі

У дадзеным стандарце выкарыстаны спасылкі на наступныя прававыя акты:

СТБ 22.0.1-96 Сістэма стандартаў у сферы адукацыі. Асноўныя палажэнні (далей СТБ 22.0.1-96)

СТБ ІСА 9000-2006 Сістэма менеджменту якасці. Асноўныя палажэнні і слоўнік (далей СТБ ІСА 9000-2006)

АКРБ 011-2009 Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь "Спецыяльнасці і *кваліфікацыя*" (далей АКРБ 011-2009)

АКРБ 005-2011 Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь "Віды эканамічнай дзейнасці" (далей АКРБ 005-2011)

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011, № 13, 2/1795) (далей - Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі).

## 3 Асноўныя тэрміны і азначэнні

У дадзеным адукацыйным стандарце выкарыстоўваюцца тэрміны, вызначаныя ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, а таксама наступныя тэрміны з адпаведнымі азначэннямі:

**Беларуская філалогія** – навука пра беларускую мову і літаратуру.

**Выкладчык беларускай мовы і літаратуры** – кваліфікацыя спецыяліста з вышэйшай універсітэцкай адукацыяй у галіне беларускай мовы і літаратуры.

**Дзелавая камунікацыя** – від прафесійнай дзейнасці, які патрабуе пэўных ведаў, уменняў і кампетэнцый у галіне дзелавой камунікацыі, дзелавога этыкету і дзелавой культуры.

**Забеспячэнне якасці** – *скаардынаваная дзейнасць па кіраўніцтву і кіраванні арганізацыяй,* накіраваная на стварэнне ўпэўненасці, што патрабаванні да якасці будуць выкананы (СТБ ІСА 9000).

**Заліковая адзінка** – *лічбавы спосаб выражэння працаёмкасці вучэбнай работы студэнта,* заснаваны на дасягненні вынікаў навучання.

**Кваліфікацыя** – веды, уменні і навыкі, неабходныя для той ці іншай прафесіі на рынках працы, якія пацверджаны дакументам аб адукацыі (СТБ 22.0.1. – 96).

**Кампетэнтнасць** – рэальная здольнасць выкарыстоўваць веды і ўменні (СТБ ІСА 9000-2006).

**Кампетэнцыя** – веды, уменні, вопыт і асобасныя якасці, неабходныя для рашэння тэарэтычных і практычных задач.

**Літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць** – від прафесійнай дзейнасці, які патрабуе пэўных ведаў, уменняў і кампетэнцый у літаратурна-рэдакцыйнай сферы.

**Літаратурна-рэдакцыйны супрацоўнік** – кваліфікацыя спецыяліста з вышэйшай адукацыяй у галіне літаратурна-рэдакцыйнай дзейнасці.

**Спецыяліст па дзелавой камунікацыі** – кваліфікацыя спецыяліста з вышэйшай адукацыяй у галіне дзелавой камунікацыі, дзелавога этыкету і дзелавой культуры.

**Спецыяліст па камп'ютарнай філалогіі** – кваліфікацыя спецыяліста з вышэйшай адукацыяй у галіне камп'ютарнага забеспячэння філалагічнай дзейнасці.

**Спецыяльнасць** – від прафесійнай дзейнасці, якая патрабуе пэўных ведаў, навыкаў і кампетэнцый, набытых шляхам навучання і практычнага вопыту (АКРБ 011-2009).

**Філолаг** – кваліфікацыя спецыяліста з вышэйшай адукацыяй у галіне філалогіі.

**Філалогія** – навука пра мовы і літаратуры.

## 4 Агульныя палажэнні

**4.1 Агульная характарыстыка спецыяльнасці**

Спецыяльнасць 1-21 05 01 "Беларуская філалогія (па напрамках)" у адпаведнасці з АКРБ 011-2009 мае дачыненне да профілю адукацыі D "Гуманітарныя навукі", напрамку адукацыі 21 "Гуманітарныя навукі". і забяспечвае атрыманне кваліфікацый: "Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры. Літаратурна-рэдакцыйны супрацоўнік", "Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры. Спецыяліст па камп'ютарнай філалогіі", "Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры. Спецыяліст па дзелавой камунікацыі".

Згодна з АКРБ 011-2009 па спецыяльнасці прадугледжаны напрамкі спецыяльнасці і спецыялізацыі:

- 1-21 05 01-01 "Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)";
- 1-21 05 01-01 01 "Мовазнаўства";
- 1-21 05 01-01 02 "Літаратуразнаўства";
- 1-21 05 01-01 03 "Рыторыка";
- 1-21 05 01-02 "Беларуская філалогія (камп'ютарная філалогія)";
- 1-21 05 01-02 01 "Мовазнаўства";
- 1-21 05 01-02 02 "Літаратуразнаўства";
- 1-21 05 01-02 03 "Рыторыка";
- 1-21 05 01-03 "Беларуская філалогія (дзелавая камунікацыя)";
- 1-21 05 01-03 01 "Мовазнаўства";
- 1-21 05 01-03 02 "Літаратуразнаўства";
- 1-21 05 01-03 03 "Рыторыка".

Напрамак спецыяльнасці "Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)" забяспечвае атрыманне кваліфікацыі "Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры. Літаратурна-рэдакцыйны супрацоўнік", напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-02 "Беларуская філалогія (камп'ютарная філалогія)" забяспечвае атрыманне кваліфікацыі "Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры. Спецыяліст па камп'ютарнай філалогіі", напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-03 "Беларуская філалогія (дзелавая камунікацыя)" забяспечвае атрыманне кваліфікацыі "Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры. Спецыяліст па дзелавой камунікацыі".

**4.2 Патрабаванні да ўзроўню асноўнай адукацыі асоб, якія паступаюць для атрымання вышэйшай адукацыі I ступені**

4.2.1 На ўсе формы атрымання вышэйшай адукацыі могуць паступаць асобы, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю або прафесійна-тэхнічную адукацыю з агульнай сярэдняй адукацыяй або сярэднюю спецыяльную адукацыю, што пацверджана адпаведным дакументам аб адукацыі.

4.2.2 Прыём асоб для атрымання вышэйшай адукацыі I ступені ажыццяўляецца ў адпаведнасці з пунктам 9 артыкула 57 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

**4.3 Агульныя мэты падрыхтоўкі спецыяліста**

Агульныя мэты падрыхтоўкі спецыяліста:

- фарміраванне і развіццё сацыяльна-прафесійнай, практыка-арыентаванай кампетэнтнасці, якая дазваляе спалучаць акадэмічныя, сацыяльна-асобасныя, прафесійныя кампетэнцыі для вырашэння задач у сферы прафесійнай і сацыяльнай дзейнасці;
- фарміраванне кампетэнцый па кіраванні вучэбна-пазнаваўчай, навукова-даследчай і іншымі відамі дзейнасці навучэнцаў, рэгуляванне адносін і стасункаў у педагагічным працэсе.

**4.4 Формы атрымання вышэйшай адукацыі першай ступені**

Навучанне па спецыяльнасці прадугледжвае наступныя формы:

- вочная (дзенная, вячэрняя);
- завочная (у тым ліку дыстанцыйная).

### 4.5 Тэрміны атрымання вышэйшай адукацыі першай ступені

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі на дзённай форме атрымання адукацыі па спецыяльнасці 1-21 05 01 "Беларуская філалогія (па напрамках)" складае 4 гады.

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі вячэрняй форме складае 5 гадоў.

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі на завочнай форме складае 5 гадоў.

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі на дыстанцыйнай форме складае 5 гадоў.

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-21 05 01 "Беларуская філалогія (па напрамках)" асобамі, якія навучаюцца па адукацыйнай праграме вышэйшай адукацыі 1 ступені, што забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй і інтэгруецца з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі, можа быць скарочаны установай вышэйшай адукацыі пры ўмове выканання патрабаванняў дадзенага адукацыйнага стандарту.

*Тэрмін навучання па адукацыйнай праграме вышэйшай адукацыі I ступені, што* забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй і інтэграванай з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў вячэрняй і завочнай (у т.л. дыстанцыйнай) формах можа павялічвацца на 0,5 – 1 год адносна тэрміну навучання па дадзенай адукацыйнай праграме на дзённай форме.

## 5 Характарыстыка прафесійнай дзейнасці спецыяліста

### 5.1 Сфера прафесійнай дзейнасці спецыяліста

Асноўнымі сферамі прафесійнай дзейнасці спецыяліста з'яўляюцца:

- 58 Выдавецкая дзейнасць;
- 72 Навуковыя доследы і распрацоўкі;
- 853 Сярэдняя адукацыя;
- 854 Вышэйшая адукацыя;
- 60 Дзейнасць па стварэнні праграм. Радыё і тэлевяшчанне;
- 6391 Дзейнасць інфармацыйных агенцтваў;
- 91 Дзейнасць бібліятэк, архіваў, музеяў і іншая дзейнасць у галіне культуры.

### 5.2 Аб'екты прафесійнай дзейнасці спецыяліста

Аб'ектамі прафесійнай дзейнасці спецыяліста з'яўляюцца: навукова-даследчыя і адукацыйныя сістэмы, педагагічныя працэсы, навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу, адукацыйныя інавацыі.

### 5.3 Віды прафесійнай дзейнасці спецыяліста

Спецыяліст павінен быць кампетэнтны ў наступных відах дзейнасці:
-навукова-педагагічнай і вучэбна-метадычнай;
-навукова-даследчай;
-праектнай;
-арганізацыйна-кіруючай;
-інавацыйнай.

### 5.4 Задачы прафесійнай дзейнасці спецыяліста

Спецыяліст павінен быць падрыхтаваны да вырашэння наступных задач прафесійнай дзейнасці:

- падрыхтоўка і правядзенне заняткаў з навучэнцамі, распрацоўка навукова-метадычнага забеспячэння;
- выкарыстанне дасягненняў навукі і перадавых тэхналогій у галіне навуковых, адукацыйных і практыка-арыентаваных працэсаў;

- распрацоўка планаў і праграм арганізацыі адукацыйнай і інавацыйнай дзейнасці ў прафесійнай сферы.

### 5.5 Магчымасці працягу адукацыі спецыяліста

Спецыяліст можа працягнуць адукацыю на II ступені вышэйшай адукацыі (у магістратуры) адпаведна з рэкамендацыямі АКРБ 011-2009.

## 6 Патрабаванні да кампетэнтнасці спецыяліста

### 6.1 Склад кампетэнцый спецыяліста

Засваенне адукацыйных праграм па спецыяльнасці 1-21 05 01 "Беларуская філалогія (па напрамках)" павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

**акадэмічных кампетэнцый**, якія ўключаюць веды і ўменні па вывучаемых дысцыплінах, здольнасці і ўменні вучыцца;

**сацыяльна-асобасных кампетэнцый**, якія ўключаюць культурна-каштоўнасныя арыентацыі, веданне ідэалагічных, маральна-этычных каштоўнасцей грамадства і дзяржавы і ўменне кіравацца імі;

**прафесійных кампетэнцый**, якія ўключаюць здольнасць вырашаць задачы, распрацоўваць планы і забяспечваць іх выкананне ў выбранай сферы прафесійнай дзейнасці.

### 6.2 Патрабаванні да акадэмічнай кампетэнцыі спецыяліста

Спецыяліст павінен:

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным прадуцыраваць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні праблем.

АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных прыстасаванняў, кіраваннем інфармацыяй і працай з камп'ютарам.

АК-8. Мець навыкі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

### 6.3. Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый спецыяліста

Спецыяліст павінен:

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльных кантактаў.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасабовых камунікацый.

САК-4. Валодаць навыкамі захавання здароўя.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-6. Умець працаваць у калектыве.

### 6.4 Патрабаванні да прафесійнай кампетэнтнасці спецыяліста

Спецыяліст павінен быць здольны:

**Навукова-педагагічная і вучэбна-метадычнай дзейнасць**

ПК-1. Планаваць, арганізоўваць і весці педагагічную (вучэбную, метадычную, выхаваўчую) дзейнасць.

ПК-2. Выкарыстоўваць розныя тэхналогіі навучання мове і літаратуры.

ПК-3. Ствараць і рэдагаваць дакументы з улікам спецыфікі дзелавой камунікацыі.

ПК-4. Ажыццяўляць маніторынг адукацыйнага працэсу, дыягностыку вучэбных і выхаваўчых вынікаў.

**Навукова-даследчая дзейнасць**

ПК-5. Планаваць, арганізоўваць і весці навукова-даследчую працу ў галіне філалогіі (тэксталогіі).

ПК-6. Выбіраць неабходныя метады даследавання, мадыфікаваць існуючыя і выкарыстоўваць новыя метады, зыходзячы з задач канкрэтнага даследавання.

ПК-7. Выкарыстоўваць у працы сучасныя камп'ютарныя метады збору, апрацоўкі і захавання інфармацыі.

ПК-8. Прадстаўляць вынікі навуковай працы ў адпаведнасці з адпаведнымі патрабаваннямі.

ПК-9. Выкарыстоўваць сучасную методыку рэферавання і рэдагавання тэкстаў.

ПК-10. Карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай на беларускай, рускай і замежных мовах.

**Праектная дзейнасць**

ПК-11. Выкарыстоўваць сучасную метадалогію лінгвістычных і літаратуразнаўчых даследаванняў, выкарыстоўваць сродкі аўтаматызацыі праектавання, афармляць праектную дакументацыю.

ПК-12. Праводзіць аналіз праектнай дзейнасці ў гуманітарнай сферы, распрацоўваць прапановы па павышэнні эфектыўнасці запланаваных доследаў.

**Арганізацыйна-кіруючая дзейнасць**

ПК-13. Арганізоўваць працу малых калектываў выканаўцаў для дасягнення пастаўленых мэт.

ПК-14. Выкарыстоўваць у сваёй дзейнасці навыкі педагагічных (дзелавых) кантактаў.

ПК-15. Узаемадзейнічаць са спецыялістамі сумежных спецыяльнасцей.

ПК-16. Весці перамовы, распрацоўваць кантракты з іншымі зацікаўленымі ўдзельнікамі.

ПК-17. Рыхтаваць даклады, матэрыялы для прэзентацый і кіраваць імі.

ПК-18. Выкарыстоўваць сучасныя сродкі тэле-і інтэрнэткамунікацый.

ПК-19. Засвойваць і рэалізоўваць інавацыі ў галіне кіравання ў прафесійнай дзейнасці.

**Інавацыйная дзейнасць**

ПК-20. Ажыццяўляць пошук, сістэматызацыю і аналіз інфармацыі па перспектывах развіцця галіны, інавацыйных тэхналогіях, праектах і рашэннях.

ПК-21. Вызначаць мэты інавацый і спосабы іх дасягнення.

ПК-22. Працаваць з навуковай, тэхнічнай і патэнтнай літаратурай.

ПК-23. Праводзіць доследы, заснаваныя на інавацыйных тэхналогіях і методыках.

ПК-24. Авалодваць і ўкараняць у навучальны працэс інавацыйныя адукацыйныя тэхналогіі.

## 7 Патрабаванні да вучэбна-праграмнай дакументацыі

### 7.1 Склад вучэбна-праграмнай дакументацыі

Адукацыйныя праграмы па спецыяльнасці 1-21 05 01 "Беларуская філалогія (па напрамках)" уключаюць наступную вучэбна-праграмную дакументацыю:

– тыпавы вучэбны план па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці);
– вучэбны план установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці, спецыялізацыі);
– тыпавыя вучэбныя праграмы па вучэбных дысцыплінах;
– вучэбныя праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбных дысцыплінах;
– праграмы практык.

### 7.2 Патрабаванні да распрацоўкі вучэбна-праграмнай дакументацыі

7.2.1 Максімальны аб’ём вучэбнай нагрузкі студэнта не павінен перавышаць 54 акадэмічныя гадзіны на тыдзень, уключаючы ўсе віды аўдыторнай і пазааўдыторнай працы.

7.2.2 Аб’ём абавязковых аўдыторных заняткаў, які вызначаецца ўстановай вышэйшай адукацыі з улікам спецыяльнасці, спецыфікі арганізацыі вучэбнага працэсу, аснашчэння вучэбна-лабараторнай базы, інфармацыйнага, навукова-метадычнага забеспячэння, устанаўліваецца ў межах 24-32 гадзіны на тыдзень.

7.2.3 У гадзіны, якія адводзяцца на самастойную працу па вучэбнай дысцыпліне, уключаецца час, прадугледжаны на падрыхтоўку да экзамену (экзаменаў) па вучэбнай дысцыпліне.

### 7.3 Патрабаванні да складання графіка адукацыйнага працэсу

7.3.1 Прыкладная колькасць тыдняў па відах дзейнасці для дзённай формы атрымання вышэйшай адукацыі вызначаецца ў адпаведнасці з табліцай 1.

Табліца 1

| Віды дзейнасці, устаноўленыя ў вучэбным плане | Тыдні | Гадзіны |
|---|---|---|
| Тэарэтычнае навучанне | 121 | 6534 |
| Экзаменацыйныя сесіі | 21 | 1134 |
| Практыка | 16 | 864 |
| Дыпломнае праектаванне | 8 | 432 |
| Выніковая атэстацыя | 4 | 216 |
| Канікулы | 29 | - |
| **Усяго** | **199** | **9180** |

7.3.2 Пры распрацоўцы вучэбнага плана ўстанова вышэйшай адукацыі мае права ўносіць змены ў графік адукацыйнага працэсу пры ўмове выканання патрабаванняў да зместу адукацыйнай праграмы, пазначаных у дадзеным адукацыйным стандарце.

7.3.3 Пры завочнай форме навучання студэнту павінна быць забяспечана магчымасць для заняткаў з асобамі з ліку прафесарска-выкладчыцкага саставу у аб’ёме не менш за 200 гадзін на год.

### 7.4 Патрабаванні да структуры тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці)

7.4.1 Тыпавы вучэбны план па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці) распрацоўваецца ў адпаведнасці са структурай, прыведзенай у табліцы 2 адукацыйнага стандарту

Табліца 2

| № п/п | Найменне цыклаў дысцыплін, вучэбных дысцыплін і відаў дзейнасці студэнта | Аб’ём работы ў гадзінах | | | Залікова адзінкі | Коды фарміруемых кампетэнцый |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | з іх: Аўдыторныя заняткі (45-70%) | з іх: Самастойная работа (30-55%) | | |
| **1** | **Цыкл сацыяльна-гуманітарных дысцыплін** | **488** | **238** | **250** | **13** | |
| | ***Дзяржаўны кампанент*** | **344** | **170** | **174** | **9** | |
| 1.1 | Філасофія | 84 | 42 | 42 | 2 | АК-2,4; САК-1,5; ПК-8,10. |
| 1.2 | Інтэграваны модуль “Эканоміка” | 116 | 60 | 56 | 3 | АК-1,2,4,5; САК-6. |
| 1.3 | Інтэграваны модуль “Паліталогія” | 72 | 34 | 38 | 2 | АК-1,2; ПК-12,15. |
| 1.4 | Інтэграваны модуль “Гісторыя” | 72 | 34 | 38 | 2 | АК-1-4,6,8; САК-1,3; |

| № п/п | Найменне цыклаў дысцыплін, вучэбных дысцыплін і відаў дзейнасці студэнта | Аб'ём работы ў гадзінах | | | Заліковыя адзінкі | Коды фарміруемых кампетэнцый |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | з іх | | | |
| | | | Аўдыторныя заняткі (45-70%) | Самастойная работа (30-55%) | | |
| | ***Кампанент установы вышэйшай адукацыі*** | **144** | **68** | **76** | **4** | АК-1-4,6; ПК-1,2,8,12-4,20. |
| **2** | **Цыкл агульнанавуковых і агульнапрафесійных дысцыплін** | **1258** | **762** | **496** | **32,5** | |
| | ***Дзяржаўны кампанент*** | **960** | **584** | **376** | **25,5** | |
| 2.1 | Бяспека жыццядзейнасці чалавека | 102 | 68 | 34 | 3 | АК-4; САК-4,6. |
| 2.2 | Інфармацыйныя тэхналогіі ў філалогіі | 72 | 36 | 36 | 2 | АК-1,2,3,5,7; САК-3; ПК-,3,9,21. |
| 2.3 | Псіхалогія | 102 | 68 | 34 | 3 | АК-1-4,6,9; САК-1-3,5,6; ПК-15,19. |
| 2.4 | Педагогіка | 106 | 68 | 38 | 3 | АК-1-7,9; САК-2,3,5-7; ПК-1-4,6,9, 11-13,15. |
| 2.5 | Замежная мова | 270 | 150 | 120 | 7 | АК-1,4,6,8,9; САК-2,3,6; ПК-1,7,11, 13. |
| 2.6 | Уводзіны ў мовазнаўства | 80 | 52 | 28 | 2 | АК-1,2,3,4,5,6,8,9; САК-3,5; ПК-2,7, 12,18. |
| 2.7 | Уводзіны ў літаратуразнаўства | 80 | 52 | 28 | 2 | АК-1-5,8,9; САК-1-3,5; ПК-7,8,12. |
| 2.8 | Агульнае мовазнаўства | 68 | 38 | 30 | 1,5 | АК-1-6,8,9; САК-3,5; ПК-2,7,12,18. |
| 2.9 | Тэорыя літаратуры | 80 | 52 | 28 | 2 | АК-1-5,8,9; САК-1-3,5; ПК-7,8,12. |
| | ***Кампанент установы вышэйшай адукацыі*** | **298** | **178** | **120** | 7 | АК-1-4,6; ПК-1,2,8,12-14,20. |
| 3 | **Цыкл спецыяльных дысцыплін** | **3888** | **2430** | **1458** | **103,5** | |
| | ***Дзяржаўны кампанент*** | **2936** | **1820** | **1116** | **79** | |
| | *Дысцыпліны спецыяльнасці* | 2642 | 1650 | 992 | 70 | |
| 3.1. | Сучасная беларуская мова | 658 | 418 | 240 | 16,5 | АК-1-6,8,9; САК-1-3; ПК-1-5,7,8,18, 20,23. |
| 3.2 | Стылістыка і культура беларускага маўлення | 86 | 50 | 36 | 2 | АК-1-9; САК-3; ПК-2,5,10-12,17. |
| 3.3 | Беларуская палеаграфія | 54 | 34 | 20 | 2 | АК-1-6; САК-1; ПК-7,12,18. |
| 3.4 | Гістарычная граматыка беларускай мовы | 208 | 136 | 72 | 5 | АК-1-4,6,8,9; САК-3; ПК-2,7,8,10,12. |
| 3.5 | Гісторыя беларускай літаратурнай мовы | 116 | 68 | 48 | 3 | АК-1-4,6,8; САК-7; ПК-7,12,26. |
| 3.6 | Беларуская дыялекталогія | 56 | 34 | 22 | 1,5 | АК-1-4,6-9; САК-2,3; ПК-2,9, 10,12,27. |
| 3.7 | Гісторыя беларускага мовазнаўства | 58 | 34 | 24 | 2 | АК-1-4,6,8; САК-1; ПК-2,7,8,12,18. |
| 3.8 | Гісторыя беларускай літаратуры | 306 | 206 | 100 | 8 | АК-1-4,6,8; САК-1,5; ПК-2,8,12,13, |

| № п/п | Найменне цыклаў дысцыплін, вучэбных дысцыплін і відаў дзейнасці студэнта | Аб'ём работы ў гадзінах | | | Залікo-выя адзінкі | Коды фарміруе-мых кампетэн-цый |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | з іх | | | |
| | | | Аўдытор-ныя заняткі (45-70%) | Самастой-ная работа (30-55%) | | |
| | | | | | | 23. |
| 3.9 | Гісторыя беларускай літаратуры XX – XXI стст. | 590 | 358 | 232 | 15,5 | АК-1-4,6,8; САК-1,5; ПК-2,8,12,13, 23. |
| 3.10 | Гісторыя замежнай літаратуры | 322 | 204 | 118 | 9,5 | АК-1-4,6,8; САК-1,5; ПК-2,8,12,13. |
| 3.11 | Методыка выкладання беларускай мовы | 94 | 54 | 40 | 2,5 | АК-1-6,8,9; САК-1-3,5,6; ПК-1-4,6, 10,12,13,18. |
| 3.12 | Методыка выкладання беларускай літаратуры | 94 | 54 | 40 | 2,5 | АК-1-6,8,9; САК-1-3,5,6; ПК-1-4,6,10, 12,13,18. |
| | *Дысцыпліны напрамку спецыяльнасці* | 294 | 170 | 124 | 9 | |
| **Напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-01 Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)** | | | | | | |
| 3.13 | Псіхалогія літаратурнай творчасці | 54 | 34 | 20 | 2 | АК-1-4,6; САК-2,3; ПК-8,12-14,18. |
| 3.14 | Асновы літаратурна-мастацкай дзейнасці | 60 | 34 | 26 | 2 | АК-1-8; САК-2,5; ПК-10,12. |
| 3.15 | Стылістычнае рэдагаванне і карэктура | 58 | 34 | 24 | 2 | АК-1-4,7,8; ПК-5,11,12. |
| 3.16 | Літаратурнае рэдагаванне | 58 | 34 | 24 | 2 | АК-1-5,8; ПК-7-9,11-13. |
| 3.17 | Лінгвістыка тэксту | (30)64 | 34 | 30 | 1 | АК-3-6,8; ПК-8,12, 13,23. |
| **Напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-02 Беларуская філалогія (камп'ютарнае забеспячэнне)** | | | | | | |
| 3.13 | Уводзіны ў камп'ютарную філалогію | 54 | 34 | 20 | 2 | АК-1-8; ПК-2,3,7-9,21,23. |
| 3.14 | Асновы праграмавання | 60 | 34 | 26 | 2 | АК-1,2,3,5,7; САК-3; ПК-2,3,9,21. |
| 3.15 | Метады аўтаматычнай апрацоўкі тэкстаў | 58 | 34 | 24 | 2 | АК-1,4,7,8; ПК-3,7,9,11. |
| 3.16 | Фармалізацыя мовы ў экспертных сістэмах | 58 | 34 | 24 | 2 | АК-1,4,7,8; ПК-3,7,9,11. |
| 3.17 | Корпусная лінгвістыка | 64 | 34 | 30 | 1 | АК-1-8; ПК-2,3,7-9,21,23. |
| **Напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-03 Беларуская філалогія (дзелавая камунікацыя)** | | | | | | |
| 3.13 | Культура дзелавога суразмоўніцтва | 54 | 34 | 20 | 2 | АК-1,4-6,8; САК-1-3,6; ПК-4, 5,15,18, 19,21. |
| 3.14 | Рыторыка прафесійнага дыялогу | 60 | 34 | 26 | 2 | АК-1,5,8; САК-2,3,6; ПК-4,15,18, 20. |
| 3.15 | Тэхніка маўлення | 58 | 34 | 24 | 2 | АК-2-4; |
| 3.16 | Рытарычныя жанры | 58 | 34 | 24 | 2 | АК-1-4,8; САК-3; ПК-8,12,13. |
| 3.17 | Культура педагагічнага суразмоўніцтва | 64 | 34 | 30 | 1 | АК-1,2,4-6,8; САК-2,3,6; ПК-1,4,6,15. |

| № п/п | Найменне цыклаў дысцыплін, вучэбных дысцыплін і відаў дзейнасці студэнта | Аб'ём работы ў гадзінах | | | Заліковыя адзінкі | Коды фарміруемых кампетэнцый |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | з іх | | | |
| | | | Аўдыторныя заняткі (45-70%) | Самастойная работа (30-55%) | | |
| | ***Кампанент установы вышэйшай адукацыі*** | **952** | **610** | **342** | **24,5** | АК-1-4,6; ПК-1,2,8,12-14,20. |
| **4** | **Цыкл дысцыплін спецыялізацыі** | **572** | **340** | **232** | **12** | АК-1-8; САК-1-6. |
| **5** | **Экзаменацыйныя сесіі** | **1134** | | **1134** | **34** | АК-1,2,4,9, ПК-12. |
| **6** | **Выкананне курсавых работ** | **120** | | **120** | **3** | АК-1-8; ПК-7,8,10, 12-14,23,24,26. |
| **7** | **Факультатыўныя дысцыпліны** | **208** | **148** | **60** | **-** | АК-2-6; ПК-7,10, 12,18. |
| | **Усяго** | **7668** | **3918** | **3750** | **198** | |
| **8** | **Практыка** | **864** | | **864** | **24** | |
| 8.1 | Фальклорная (вучэбная), 2 тыдні | 108 | | 108 | 3 | АК-1,4,7,8; САК-2,3; ПК-8,10. |
| 8.2 | Дыялекталагічная (вучэбная), 2 тыдні | 108 | | 108 | 3 | АК-1,2,4,6,8; САК-2,3,6; ПК-8. |
| 8.3 | а) Літаратурна-рэдакцыйная (вытворчая), 2 тыдні[1]; б) Камп'ютарнае забеспячэнне філалагічнай дзейнасці (вытворчая), 2 тыдні[2]; в) Камунікатыўна-дзелавая (вытворчая), 2 тыдні[3]. | 108 | | 108 | 3 | АК-1-4,7,8; САК-2,3,5,6; ПК-2,3,7,8.11,23. |
| 8.4. | Пераддыпломная, 10 тыдняў | 540 | | 540 | 15 | АК-1-8; САК-1-6; ПК-1,2,4,6-8,10,13, 14,24. |
| **9** | **Дыпломнае праектаванне** | **432** | | **432** | **12** | АК-1-9; ПК-7-13,20. |
| **10** | **Выніковая атэстацыя** | **216** | | **216** | **6** | АК-1,2,4,9, ПК-12. |
| **11** | **Дадатковыя віды навучання** | **/420** | **/420** | | | |
| | Физическая культура | 420 | 420 | | | САК-4 |

7.4.2 У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці) распрацоўваецца вучэбны план установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці, спецыялізацыі), у якім установа вышэйшай адукацыі мае права ў межах 15% змяняць колькасць гадзін, што адводзяцца для засваення вучэбных дысцыплін, а аб'ёмы цыклаў дысцыплін – у межах 10% без перавышэння максімальнага аб'ёму нагрузкі студэнта на тыдзень і пры захаванні патрабаванняў да зместу адукацыйнай праграмы, якія пазначаны ў дадзеным адукацыйным стандарце.

7.4.3 Пры распрацоўцы вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці, спецыялізацыі) рэкамендуецца прадугледжваць вучэбныя дысцыпліны па выбары студэнта ў аб'ёме да 50% ад колькасці вучэбных гадзін, адведзеных на кампанент установы вышэйшай адукацыі.

7.4.4 Пералік кампетэнцый, што фарміруюцца пры вывучэнні вучэбных дысцыплін кампанента установы вышэйшай адукацыі, дапаўняецца установай вышэйшай адукацыі ў вучэбных праграмах.

7.4.5 Адна заліковая адзінка адпавядае 36-40 акадэмічным гадзінам.

---

[1] Напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-01 Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць).
[2] Напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-02 Беларуская філалогія (камп'ютарное забеспячэнне).
[3] Напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-03 Беларуская філалогія (дзелавая камунікацыя).

Сума заліковых адзінак пры атрыманні вышэйшай адукацыі на дзённай форме павінна быць роўнай 60 за 1 год навучання. Сума заліковых адзінак за увесь перыяд навучання пры атрыманні вышэйшай адукацыі на вячэрней і завочнай (у т.л. дыстанцыйнай) формах павінна быць роўнай суме заліковых адзінак за ўвесь перыяд навучання пры атрыманні вышэйшай адукацыі на дзённай форме.

7.4.6 Установы вышэйшай адукацыі маюць права пераводзіць 40% прадугледжаных тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці) аўдыторных заняткаў у кіруемую самастойную работу студэнта.

**7.5 Патрабаванні да абавязковага мінімуму зместу вучэбных праграм і кампетэнцый па вучэбных дысцыплінах**

7.5.1 Праектуемыя вынікі засваення вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне дзяржаўнага кампанента кожнага цыкла прадстаўляюцца ў выглядзе абавязковага мінімуму зместу і патрабаванняў да ведаў, уменняў і навыкаў.

7.5.2 Цыкл сацыяльна-гуманітарных дысцыплін вызначаецца ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам "Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Цыкл сацыяльна-гуманітарных дысцыплін", які ўключае абавязковы мінімум зместу і патрабаванні да кампетэнцый, і з улікам Канцэпцыі аптымізацыі зместу, структуры і аб'ёму сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ва ўстановах вышэйшай адукацыі.

7.5.3 Цыкл агульнанавуковых і агульнапрафесійных дысцыплін:

***Бяспека жыццядзейнасці чалавека***

*Арганізацыя абароны насельніцтва і аб'ектаў ад надзвычайных сітуацый. Першая дапамога ў надзвычайных сітуацыях. Забеспячэнне радыяцыйнай бяспекі. Глабальныя экалагічныя праблемы. Забеспячэнне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў. Забеспячэнне энергетычнай бяспекі і энергетычнай незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Энергазберагальныя тэхналогіі ў побыце. Забеспячэнне аховы працы. Санітарна-гігіенічныя патрабаванні да вытворчага асяроддзя. Вытворчая бяспека.*

У выніку вывучэння інтэграванай вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– заканадаўства ў галіне пажарнай і радыяцыйнай бяспекі, абароны насельніцтва і тэрыторый ад надзвычайных сітуацый;

– асноўныя прынцыпы, сродкі і спосабы абароны ад надзвычайных сітуацый;

– асновы рацыянальнага прыродакарыстання, меры па папярэджанні экалагічнага дрэннага становішча геасфер Зямлі;

– прыярытэтныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў галіне энергазберажэння;

– заканадаўства ў галіне аховы працы;

**умець:**

– ажыццяўляць арганізацыйныя і тэхнічныя мерапрыемствы па забеспячэнні бяспекі жыццядзейнасці;

– аналізаваць сітуацыю, распазнаваць крыніцу небяспекі і прадпрымаць дзеянні па выратаванні уласнага жыцця, жыцця вытворчага персаналу, памяншэння шкоды здароўю людзей;

– выкарыстоўваць сродкі індывідуальнай і калектыўнай абароны;

**валодаць:**

– навыкамі абароны ад надзвычайных сітуацый і небяспечных вытворчых фактараў;

– навыкамі аказання першай дапамогі ў надзвычайных сітуацыях, пры няшчасных выпадках на вытворчасці і ў побыце.

**Інфармацыйныя тэхналогіі ў філалогіі**

*Інфарматыка і інфармацыйныя тэхналогіі ў прафесійнай дзейнасці. Прадмет і асноўныя паняцці інфарматыкі. Апаратнае і праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій.*

*Асноўныя прынцыпы аўтаматызацыі працы з тэкстам складанай структуры (у т.л. тымі, якія змяшчаюць табліцы, схемы, матэматычныя формулы, дыяграмы і іншыя аб'екты). Ажыццяўленне матэматычных разлікаў у таблічным працэсары, графічнае прадстаўленне дадзеных. Выкарыстанне інфармацыйных сістэм і электронных баз дадзеных. Глабальная інфармацыйная прастора інтэрнэт, сацыяльныя сеткі. Праца з мультымедыя.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

– ролю і месца інфармацыйных тэхналогій у прафесійнай дзейнасці;
– прызначэнне і прынцыпы працы апаратных сродкаў, аперацыйных сістэм і прыкладных праграм (тэкставых, таблічных працэсараў, праграм для распрацоўкі графічных і мультымедыйных прадуктаў, сістэм кіравання базамі дадзеных) пры вырашэнні задач збору, сістэматызацыі, апрацоўкі і захавання інфармацыі;
– магчымасці эфектыўнага выкарыстання і папаўнення рэсурсаў інтэрнэт, прынцыпы функцыянавання сацыяльных сетак;

***умець:***

– працаваць з файлавай сістэмай, прыкладным праграмным забеспячэннем, праводзіць простыя аперацыі па абслугоўванні камп'ютараў;
– рэдагаваць і фармаціраваць дакументы, якія ўтрымліваюць тэкст, табліцы, малюнкі, схемы, формулы, дыяграмы, аб'екты мультымедыя;
– ствараць простыя базы дадзеных карыстальніка і праводзіць асноўныя аперацыі з імі;
– распрацоўваць структуру, напаўняць зместам, выбіраць дызайн слайдаў для электроннай прэзентацыі вынікаў вучэбна-даследчай і прафесійнай дзейнасці;
– прымяняць электронныя табліцы для апрацоўкі эксперыментальных дадзеных і матэматычнага мадэлявання;
– карыстацца асноўнымі магчымасцямі, паслугамі і інфармацыйнымі рэсурсамі камп'ютарных сетак, у т. л. сеткі інтэрнэт;
– выкарыстоўваць сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі ў сваёй вучэбнай, навуковай і прафесійнай дзейнасці;

***валодаць:***

– навыкамі стварэння, фармаціравання, рэдагавання дакументаў з дапамогай тэкставых працэсараў і рэдактараў;
– навыкамі працы з электроннымі табліцамі;
– сродкамі эфектыўнага пошуку інфармацыі ў інтэрнэт, эфектыўнага выкарыстання інтэрнэт-рэсурсаў у вучэбнай, навуковай і прафесійнай дзейнасці;
– методыкай асваення новых інфармацыйных тэхналогій у сваёй прафесійнай дзейнасці.

**Псіхалогія**

*Псіхалогія як навука. Асноўныя задачы, аб'ект і прадмет псіхалогіі. Метадалогія і метады псіхалогіі. Паняцце пра псіхіку: свядомасць, перадсвядомае, несвядомае. Канфлікты ў міжасобасных адносінах. Малыя групы: структура і характарыстыка. Асоба як аб'ект кіравання і самакіравання. Арганізацыя як аб'ект кіравання. Кіраўнік, яго асоба і дзейнасць як суб'екты кіравання.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

– паняцці і катэгорыі, агульнакультурнае значэнне і месца псіхалогіі ў сістэме навук пра чалавека і грамадства;
– індывідуальна-псіхалагічныя якасці і асаблівасці асобы, спосабы матывацыі і рэгуляцыі паводзін і дзейнасці;
– сацыяльна-псіхалагічныя механізмы і заканамернасці паводзін асобы і групы;

***умець:***

- улічваць сацыякультурныя тэндэнцыі, заканамернасці і прынцыпы навучання і выхавання пры аналізе сацыяльна-адукацыйнай практыкі;
- арганізоўваць прадуктыўнае міжасобаснае і прафесійнае ўзаемадзеянне і зносіны, у тым ліку ва ўмовах полікультурнага асяроддзя;
- выкарыстоўваць псіхолага-педагагічныя веды, метады і тэхналогіі навучання і выхавання ў прафесійнай дзейнасці, пры правядзенні навучальных заняткаў з персаналам;
- забяспечваць паўнавартаснае развіццё і выхаванне дзяцей у сям'і, узаемасувязь пакаленняў;

***валодаць:***

- прыёмамі рэгуляцыі ўласных эмоцый і псіхічных станаў;
- элементарнымі навыкамі складання псіхалагічнай характарыстыкі асобы;
- спосабамі вызначэння стылю кіравання і кіраўніцва групай.

**Педагогіка**

*Гісторыя адукацыі і педагагічнай думкі. Педагогіка ў сістэме навук аб чалавеку. Сістэма адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і напрамкі яе ўдасканалення ў кантэксце сусветных сацыякультурных тэндэнцый. Роля вучэбнай дзейнасці ў развіцці асобы. Змест адукацыі. Метады, формы і сродкі навучання. Педагагічныя тэхналогіі ў адукацыйным працэсе. Сучаснае вучэбна-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу. Выхаванне як сацыяльная з'ява і педагагічны працэс. Сутнасць, заканамернасці і прынцыпы працэсу выхавання і самавыхавання. Выхаванне вучняў у сям'і, калектыве, соцыуме. Асновы прафесійнай педагагічнай дзейнасці і педагагічнага майстэрства.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

– агульнакультурнае значэнне педагогікі, асновы педагагічнай прафесіі і сутнасць педагагічнай дзейнасці;

– падыходы і прынцыпы адбору і канструявання зместу навучання і выхавання;

– асноўныя формы арганізацыі, сродкі і тэхналогіі (методыкі) працэсаў навучання і выхавання; спосабы дыягностыкі вынікаў адукацыі; тэарэтыка-практычныя асновы кіравання якасцю адукацыі;

***умець:***

– канструяваць змест выхавання і навучання, усталёўваць міждысцыплінарныя сувязі;

– праектаваць і арганізоўваць розныя формы вучэбных заняткаў і выхаваўчых мерапрыемстваў;

– распрацоўваць і ўдасканальваць вучэбна-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу, у тым ліку на аснове сродкаў інфармацыйных тэхналогій, уключаючы распрацоўку сродкаў яго дыягностыкі;

***валодаць:***

– метадамі і тэхналогіямі навучання і выхавання;

– сродкамі арганізацыі і дыягностыкі адукацыйнага працэсу, кіравання ім з улікам асобасных асаблівасцяў навучэнцаў.

**Замежная мова**

*Замежная мова як сродак міжнацыянальных і міжасобасных зносін. Агульнакультурныя звесткі пра краіну вывучаемай мовы. Асноўныя нарматыўныя фанетычныя, граматычныя, лексічныя правілы. Віды маўленчай дзейнасці: успрыманне, гаварэнне, чытанне, пісьмо на замежнай мове. Рэферыраванне, анатаванне і пераклад спецыяльнай літаратуры. Маўленчы этыкет.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

- асноўныя фанетычныя, граматычныя і лексічныя правілы, якія дазваляюць выкарыстоўваць замежную мову як сродак зносін;
- асаблівасці прафесійна-арыентаванага пісьмовага і вуснага маўлення;

***умець:***

- разумець тэксты на тэмы, звязаныя з прафесійнай дзейнасцю;
- знаходзіць неабходную інфармацыю агульнага характару ў такіх матэрыялах для штодзённага карыстання, як лісты, брашуры і кароткія афіцыйныя дакументы;
- зрабіць простае, загадзя падрыхтаванае паведамленне па знаёмай тэматыцы;
- упэўнена камунікаваць на прафесійныя тэмы ў галіне асабістых і прафесійных інтарэсаў;
- абменьвацца інфармацыяй, пераконвацца ў яе правільнасці і пацвярджаць яе дакладнасць;
- упэўнена камунікаваць на штодзённыя і іншыя тэмы ў галіне асабістых і прафесійных інтарэсаў;
- уменне карыстацца першаснымі навыкамі дзелавога ліставання і афармлення дакументацыі, выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі;
- перакладаць аўтэнтычныя тэксты па спецыяльнасці з замежнай мовы на родную мову з выкарыстаннем слоўніка і даведнікаў.

***валодаць:***

- навыкамі перакладу прафесійна-арыентаваных маўленчых твораў;
- усімі відамі чытання для работы са спецыялізаванай аўтэнтычнай літаратурай;
- навыкамі і ўменнямі прафесійна-арыентаванага дыялагічнага і маналагічнага маўлення;
- валодаць навыкамі работы з даведнікамі па адпаведнай галіне навукі.

**Уводзіны ў мовазнаўства**

*Мова і грамадства. Мова і мысленне. Дыхатамія мовы і маўлення. Маўленчая дзейнасць. Мова як сістэма знакаў. Функцыі мовы. Артыкуляцыйная і акустычная класіфікацыі гукаў. Фанема. Марфеміка і словаўтварэнне. Граматычнае значэнне, граматычная форма, граматычная катэгорыя. Слова як асноўная адзінка мовы, яго функцыі і ўласцівасці. Адносіны паміж словамі ў мове і маўленні. Уласцівасці і будова сказа. Выказванне. Генеалагічная класіфікацыя моў. Тыпалагічная класіфікацыя моў. Пісьмо. Паходжанне мовы.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

- асноўныя структурныя ўласцівасці і параметры, уласцівыя любой мове;
- законы пабудовы і ўзаемадзеяння адзінак кожнага ўзроўню моўнай сістэмы;
- асноўныя ўласцівасці моўнага знака;
- асноўныя ўласцівасці мовы як важнейшага сродку зносін, структуру камунікатыўнага акта;
- генеалагічную класіфікацыю моў, месца вывучаемых моў у класіфікацыі, іх адносіны з іншымі мовамі;
- асноўныя прынцыпы тыпалогіі моў.

***умець:***

- прымяняць тэарэтычныя палажэнні да вывучаемых моў;
- раскрываць сугнасць моўных з'яў з дэманстрацыяй на канкрэтных прыкладах з розных моў;
- свабодна карыстацца вывучаным тэрміналагічным апаратам;
- вырашать практычныя задачы, зязаныя з выкарыстаннем роднай і замежнай моў;

***валодаць:***

- навыкамі прымянення метадаў агульналінгвістычнага аналізу;
- метадамі рашэння лінгвістычных задач;
- асноўнымі прыёмамі творчага аналізу моўнага матэрыялу і лінгвістычнай літаратуры.

**Уводзіны ў літаратуразнаўства**

*Літаратура як від мастацтва. Месца і роля літаратуры ў грамадскім жыцці. Функцыі літаратуры. Літаратурны вобраз. Прынцыпы і сродкі мастацкай тыпізацыі. Пафас літаратурнага твора. Роды, віды і жанры літаратуры. Паэтыка літаратуры. Структура і кампаненты паэтыкі эпічнага, лірычнага і драматычнага літаратурнага твора. Асновы вершаскладання. Літаратурны працэс. Літаратурныя метады, напрамкі, плыні, школы. Стыль пісьменніка (творчая індывідуальнасць). Літаратурныя сувязі (кантактныя, генетычныя,*

*тыпалагічныя). Мастацкі пераклад як найважнейшая форма літаратурных сувязей. Прынцыпы аналізу літаратурнага твора. Крытэрыі ацэнкі мастацкага твора.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

- асноўныя тэарэтычныя паняцці, звязаныя з эстэтыкай і паэтыкай літаратурнага твора, літаратурным працэсам;
- сістэму літаратуразнаўчых дысцыплін і іх сувязі з іншымі гуманітарнымі навукамі і дапаможнымі галінамі літаратуразнаўства;
- спецыфічныя асаблівасці эпасу, лірыкі і драмы як родаў літаратуры, вершаванай і празаічнай формы выказвання, асноўныя складнікі стылю пісьменніка.

***умець:***

- вызначаць асноўную ідэйную накіраванасць, тэматыку, праблематыку, пафас літаратурных твораў;
- разглядаць літаратурны твор у арганічным адзінстве яго зместу і формы;
- вызначаць асаблівасці стылю пісьменніка, супастаўляць творчыя індывідуальнасці розных мастакоў слова;
- аналізаваць літаратурны твор, выяўляць яго вартасці і магчымыя недахопы;

***валодаць:***

- належным комплексам сучасных тэарэтыка-літаратурных тэрмінаў і паняццяў, асноўнымі прынцыпамі аналізу літаратурных твораў, неабходнымі для глыбейшага спасціжэння гісторыка-літаратурных курсаў, напісання курсавых, семінарскіх і дыпломных прац па літаратуры.

**Агульнае мовазнаўства**

*Структура і метады мовазнаўства. Тыпы знакаў і знакавых сістэм. Мова як знакавая сістэма. Сацыялінгвістыка, яе асноўныя напрамкі. Сацыяльныя функцыі мовы. Мова і культура. Мова і рэлігія. Народы свету і мовы. Нацыянальна-моўная палітыка. Формы існавання мовы. Прынцыпы дыяхранічнага мовазнаўства. Псіхалінгвістыка, яе асноўныя напрамкі. Тэорыя маўленчай дзейнасці. Тыпалогія моў і лінгвістыка ўніверсалій.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

- семіятычную канцэпцыю мовы, аспекты плана зместу моўнага знака, узаемадзеянне і карэляцыю ўзроўняў моўнай структуры;
- функцыі мовы і маўлення;
- формы існавання мовы; тыпы нарматыўна-функцыянальных стыляў моў; прынцыпы кадыфікацыі мовы;
- асновы сацыяльнай лінгвістыкі, узаемаадносіны мовы і культуры, мовы і рэлігіі;
- асноўныя прынцыпы моўнай палітыкі;
- псіхалінгвістычную канцэпцыю мовы; асноўныя этапы і асаблівасці спараджэння і ўспрыняцця маўлення; антагенез маўленчых функцый і камунікатыўнай кампетэнцыі чалавека;
- асновы тыпалогіі моў і лінгвістыкі ўніверсалій;
- прынцыпы дыяхранічнага мовазнаўства;
- напрамкі і асноўныя этапы гісторыі мовазнаўства.

***умець:***

- устанаўліваць агульныя ці прыватныя рысы мовы як эмпірычна, так і даследуючы значымыя для ўсіх людзей заканамернасці функцыянавання мовы;
- арыентавацца ў нацыянальна-моўнай палітыцы і правільна прымяняць яе інструменты;
- прымяняць псіхалінгвістычныя дыдактычныя прынцыпы ў выкладанні нярoднай мовы;
- прымяняць на практыцы прынцыпы моўнай кадыфікацыі і нармавання;

***валодаць:***

- асноўнымі прыёмамі функцыянальнага і тыпалагічнага аналізу моў свету;

- навыкамі практычнага прымянення прынцыпаў кадыфікацыі і нармавання;
- метадамі выкарыстання інструментарыю нацыянальна-моўнай палітыкі;
- асновамі сацыя- і псіхалінгвістычнага аналізу функцыянавання мовы ў асноўных сферах камунікацыі.

**Тэорыя літаратуры**

*Тэорыя літаратуры як дысцыпліна. Сучасны стан навукі пра літаратуру. Цэласна-антрапалагічная версія структуры мастацкасці. Вобраз як асаблівая мова культуры. Асоба як суб'ект і аб'ект эстэтычнай дзейнасці. Літаратурны твор як мастацкае цэлае. Шматузроўневая структура літаратурна-мастацкага твора. Модусы мастацкасці. Стратэгіі мастацкай тыпізацыі. Персанацэнтрычная валентнасць. Род. Метажанр. Жанр. Стыль. Фактары і кампаненты стылю. Генезіс мастацкага твора і літаратурнай творчасці. Літаратурны працэс. Мастацкія сістэмы, метады, напрамкі. Псіхалагізм у літаратуры. Нацыянальнае як фактар мастацкасці ў літаратуры. Крытэрыі мастацкасці літаратурнага твора. Прынцыпы аналізу літаратурнага твора. Метадалогія літаратуразнаўства.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

- адрозненні «вобраза» як своеасаблівай мовы і культуры ад «паняцця», «сістэмы» ад «цэласнасці»;
- сучасную, цэласна-антрапалагічную версію структуры мастацкасці, увасобленую ў шматузроўневай мадэлі літаратурна-мастацкага твора;
- заканамернасці літаратурнага працэсу;
- сутнасць праблем, якія тычацца прыроды мастацкай творчасці;
- функцыі літаратуры як інструмента духоўнага ўдасканалення асобы;
- метадалагічныя параметры літаратуразнаўства.

***умець:***

- адрозніваць інтэрпрэтацыю ад навуковага аналізу літаратурна-мастацкага твора;
- аддзяляць «план зместу» твора ад «плана выражэння» (стылю);
- арыентавацца ў тэндэнцыях літаратурнага працэсу.

***валодаць:***

- навыкамі стылёвага аналізу літаратурна-мастацкага твора з улікам яго шматузроўневай цэласнасці.

7.5.4 Цыкл спецыяльных дысцыплін:

**Сучасная беларуская мова**

*Беларуская мова як найважнейшы элемент нацыянальнай культуры, аснова нацыянальнай ідэнтыфікацыі. Структура і функцыі беларускай мовы. Літаратурная мова: норма і узус. Беларуская мова ў сінхраніі і дыяхраніі. Мова як шматузроўневая сістэма, структурна-семантычны і функцыянальны падыходы да яе вывучэння. Фанетыка, фаналогія, арфаэпія: адзінкі фанетыкі, складовая структура слова, фаналагічная сістэма, нормы літаратурнага вымаўлення. Графіка і арфаграфія: арфаграфічнае афармленне пісьмовага маўлення. Лексікалогія і лексічная семантыка: тыпы значэнняў, класіфікацыя слоўнікавага складу мовы. Фразеалогія. Лексікаграфія: тыпы слоўнікаў. Марфеміка: тыпалогія марфем. Словаўтварэнне: адносіны словаўтваральнай вытворнасці паміж словамі, комплексныя адзінкі словаўтваральнай сістэмы (словаўтваральнае гняздо, словаўтваральны тып), спосабы словаўтварэння. Марфаналогія: фармальныя відазмяненні вытворных слоў у працэсе словатворчасці. Марфалогія: асноўныя адзінкі марфалогіі, тыпалогія часцін мовы, асаблівасці іх словазмянення і функцыянавання. Сінтаксіс: словазлучэнне, просты сказ, яго тыпалогія і віды ўскладнення, складаны сказ і яго тыпалогія. Складанае сінтаксічнае цэлае. Камунікатыўны сінтаксіс. Пунктуацыйнае афармленне пісьмовага маўлення.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

- змест асноўных лінгвістычных паняццяў;
- артыкуляцыйныя і акустычныя характарыстыкі гукаў, складовую і акцэнтную структуру слова, класіфікацыю фанем, арфаэпію, прынцыпы беларускай графікі і арфаграфіі;
- катэгарыяльныя лексіка-семантычныя адносіны і класы адзінак (полісемія, аманімія, *сінанімія, антанімія, семантычнае поле*), класіфікацыю слоўнікавага складу мовы і фразеалагічных адзінак; тыпалогію марфем, асноўныя адзінкі словаўтваральнай сістэмы, спосабы словаўтварэння;
- тыпалогію часцін мовы, іх семантычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і словаўтваральныя характарыстыкі;
- віды сінтаксічнай сувязі ў словазлучэнні, простым сказе і складаным сказе, тыпалогію семантыка-сінтаксічных адносін паміж іх кампанентамі, прынцыпы класіфікацыі сінтаксічных адзінак.

***умець:***

- карыстацца лінгвістычнай тэрміналогіяй: дыферэнцыраваць асноўныя моўныя адзінкі;
- характарызаваць моўныя адзінкі з пункту погляду іх семантыкі, структуры і функцыі;
- праводзіць фанетычны аналіз слова;
- класіфікаваць лексічныя адзінкі з пункту гледжання паходжання, актыўнага і пасіўнага запасу, сферы ўжывання і стылістычнай дыферэнцыяцыі, вызначаць тыпы фразеалагізмаў з пункту гледжання семантычнай злітнасці кампанентаў; праводзіць марфемны і словаўтваральны аналіз слоў, вызначаць марфаналагічныя відазмяненні вытворных слоў;
- праводзіць марфалагічны аналіз самастойных і службовых часцін мовы;
- праводзіць аналіз сінтаксічных адзінак (словазлучэння, простага і складанага сказа);
- самастойна працаваць з навукова-даведачнай і метадычнай літаратурай па мовазнаўстве;

***валодаць:***

- нормамі вуснага і пісьмовага маўлення сучаснай беларускай літаратурнай мовы;
- паняццямі і тэрмінамі ў іх сістэмна-структурных сувязях;
- формамі і метадамі лінгвістычнага аналізу рознаўзроўневых моўных адзінак;
- сучаснымі тэхнічнымі сродкамі навучання, інфармацыйнымі і камп'ютарнымі тэхналогіямі ў працэсе самастойнага назапашвання ведаў па мове.

**Стылістыка і культура беларускага маўлення**

*Мова як сродак камунікацыі. Камунікацыйная скіраванасць стылістыкі і культуры маўлення. Генезіс стылістыкі і культуры маўлення. Асноўныя паняцці і катэгорыі культуры маўлення. Маўленчая норма, яе роля ў станаўленні і функцыянаванні беларускай літаратурнай мовы. Асноўныя разнавіднасці маўленчых зносін. Нарматыўныя, камунікацыйныя, этычныя аспекты вуснага і пісьмовага маўлення. Фукцыянальныя стылі сучаснай беларускай мовы, іх узаемадзеянне, умовы функцыянавання, жанравыя разнавіднасці. Спецыфіка выкарыстання элементаў розных моўных узроўняў у функцыянальных стылях. Стылістыка тэксту. Мастацкі пераклад. Стылістыка арыгінальнага перакладу мастацкіх тэкстаў з блізкароднасных моў. Стылістыка арыгінальга і перакладнога тэкстаў.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

- функцыянальныя стылі сучаснай беларускай літаратурнай мовы, іх жанравыя разнавіднасці;
- стылістычныя патэнцыі моўных сродкаў, мэтазгоднасць іх выкарыстання ў канкрэтным тэксце;
- сістэму літаратурных нормаў беларускай мовы, іх рэалізацыю ў функцыянальных стылях;
- умовы і формы маўленчай камунікацыі;

***умець:***

- дыферэнцыраваць функцыянальныя стылі беларускай літаратурнай мовы;
- аналізаваць і ацэньваць моўныя сродкі, іх стылістычны патэнцыял і мэтазгоднасць выкарыстання ў тэкстах розных стыляў і жанраў;

- карыстацца стылістычна-арталагічнымі паняццямі, катэгорыямі і тэрмінамі ў іх сістэмна-структурных сувязях;
- перакладаць living рознастылёвыя рускамоўныя тэксты на беларускую мову;
- карыстацца навуковай, даведачнай і метадычнай літаратурай.

***валодаць:***
- нормамі вуснага і пісьмовага маўлення сучаснай беларускай літаратурнай мовы;
- паняццямі і тэрмінамі ў іх сістэмна-структурных сувязях;
- формамі і метадамі лінгвістычнага перакладу на беларускую мову з блізкароднасных моў, найперш рускай;
- сучаснымі тэхнічнымі сродкамі навучання, інфармацыйнымі і камп'ютарнымі тэхналогіямі ў працэсе самастойнага назапашвання ведаў па стылістыцы.

**Беларуская палеаграфія**

*Палеаграфія як гісторыка-лінгвістычная дысцыпліна. Славянскія азбукі. Кірыліца, лацініца і арабіка ў гісторыі беларускага пісьменства. Кітабы як моўна-графічны феномен у гісторыі беларускай мовы. Стылі пісьма (устаў, паўустаў, скарапіс). Арнамент і яго віды. Палеаграфічныя асаблівасці кніг і рукапісаў. Шрыфт выданняў Ф. Скарыны, асаблівасці гравюр, буквіц і ініцыялаў беларускага першадрукара. Графіка-арфаграфічныя асаблівасці выданняў С. Буднага, В. Цяпінскага, І. Фёдарава, "Статута ВКЛ 1588 г." і інш. Неаграфія і тэксталогія.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***
- метады і прыёмы палеаграфічнага аналізу;
- асноўныя тэрміны і паняцці;
- тры графічныя сістэмы беларускага пісьма;
- стылі пісьма, элементы кніжных упрыгажэнняў;

***умець:***
- вызначаць графіка-арфаграфічныя асаблівасці рукапісаў і старадрукаў;
- аналізаваць помнікі пісьменства з пункту гледжання іх гісторыі напісання, месца і часу стварэння, літаратурнага саставу, пісьмовага матэрыялу і інш.;
- свабодна чытаць аналізуемыя тэксты;

***валодаць:***
- навыкамі палеаграфічнага аналізу старажытных тэкстаў;
- уменнямі графіка-арфаграфічнай інтэрпрэтацыі аналізуемых крыніц, вызначэння найбольш характэрных асаблівасцей іх.

**Гістарычная граматыка беларускай мовы**

*Змест і сутнасць гістарычнай граматыкі як асобнай дысцыпліны гісторыка-лінгвістычнага цыкла. Перыядызацыя гісторыі беларускай мовы. Крыніцы вывучэння гістарычнай граматыкі беларускай мовы. Асноўныя метады вывучэння гістарычнай граматыкі. Месца беларускай мовы сярод іншых славянскіх моў. Асаблівасці развіцця беларускай мовы ў розных гістарычных умовах. Гісторыя гукавых змяненняў і фаналагічных адносін. Адлюстраванне вынікаў фанетычных працэсаў ва ўсходнеславянскіх гаворках дапісьмовай пары. Фанетычныя змяненні ў беларускіх гаворках пасля X ст. Характарыстыка старажытнага марфалагічнага ладу. Гісторыя часцін мовы і граматычных катэгорый. Тыпы скланення назоўнікаў і іх эвалюцыя. Формаўтварэнне і сінтаксічныя функцыі іменных і займенных прыметнікаў. Гісторыя дзеяслоўных формаў. Развіццё трывальна-часавай сістэмы дзеяслова. Гісторыя лічыльных слоў, фарміраванне лічэбніка як часціны мовы. Прыслоўе і яго гісторыя. Службовыя словы і выклічнікі. Гістарычныя змены сінтаксічных сувязей і сродкаў іх выражэння.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***
- асноўныя тэндэнцыі развіцця фанетычнай сістэмы беларускай мовы ў розныя гістарычныя перыяды;

- асноўныя этапы эвалюцыі граматычнага ладу: адміранне старых і зараджэнне новых граматычных катэгорый;
- змены ў сістэме словазмянення (скланення і спражэння) і функцыянальным выкарыстанні граматычных формаў у сінтаксічных канструкцыях;

***умець:***

- знаходзіць ілюстрацыі гістарычным моўным з'явам у помніках пісьменства;
- даваць гістарычны каментарый фактам сучаснай мовы ў яе літаратурным і дыялектным варыянтах: выяўляць гістарычныя чаргаванні ў фанетыцы, аналізаваць варыянтныя граматычныя формы паводле іх паходжання, тлумачыць гістарычныя змены ў структуры асобных слоў;

***валодаць:***

- навыкамі асэнсаванага выкарыстання асноўных тэрмінаў і паняццяў гістарычнага мовазнаўства;
- прыёмамі выкарыстання разнастайных крыніц інфармацыі для атрымання звестак па гістарычнай граматыцы (навуковыя працы, энцыклапедыі, гістарычныя і этымалагічныя слоўнікі, а таксама internet).

**Гісторыя беларускай літаратурнай мовы.**

*Праблема перыядызацыі гісторыі беларускай літаратурнай мовы. Крыніцы вывучэння гісторыі фарміравання стыляў і ўласцівых для іх сродкаў выразнасці. Усходнеславянскі перыяд як перадгісторыя беларускай літаратурнай мовы. Жанрава-стылявая дыферэнцыяцыя старабеларускай літаратурнай мовы. Асаблівасці яе функцыянавання ў часы Вялікага Княства Літоўскага. Канцылярска-юрыдычнае пісьменства як асноўная сфера выкарыстання і выпрацоўкі лінгвістычных нормаў. Стан і сферы выкарыстання беларускай літаратурнай мовы ва ўмовах адсутнасці дзяржаўнай самастойнасці. Змены ў структуры беларускай літаратурнай мовы ў пасляkастрычніцкі час, фарміраванне новых стыляў і спецыфічных для іх сродкаў выказвання. Перспектывы развіцця беларускай літаратурнай мовы ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

- асноўныя перыяды і этапы гісторыі беларускай літаратурнай мовы, іх храналагічныя межы;
- лінгвістычныя і экстралінгвістычныя фактары развіцця літаратурнай мовы;
- грамадскія функцыі беларускай літаратурнай мовы на кожным этапе яе функцыянавання;
- жанрава-стылявую дыферэнцыяцыю літаратурнай мовы старабеларускага і новага перыядаў;
- найбольш значныя літаратурныя помнікі старабеларускага пісьменства і іх моўныя асаблівасці;

***умець:***

- праводзіць лінгвістычны аналіз тэкстаў розных жанрава-стылістычных разнавіднасцей;
- на аснове праведзенага лінгвістычнага аналізу вызначаць стылёвую і храналагічную прыналежнасць пэўнага літаратурнага тэксту;
- арыентавацца ў моўнай сітуацыі перыяду, да якога належыць той або іншы тэкст, а таксама ў характары тэндэнцый развіцця беларускай літаратурнай мовы, адлюстраваных у тэкстах;
- тлумачыць паходжанне гістарычна дэтэрмінаваных фактаў сучаснай беларускай мовы;

***валодаць:***

- тэарэтычнымі асновамі гісторыі фарміравання стыляў беларускай літаратурнай мовы і выпрацоўкі ўласцівых для кожнага стылю прыёмаў і сродкаў літаратурнага выказвання;
- корпусам тэрмінаў і азначэнняў, якія рэпрэзентуюць тэарэтычныя асновы дысцыпліны;
- методыкай лінгвастылістычнага аналізу пісьмовых тэкстаў з улікам спецыфікі кожнага з перыядаў гісторыі беларускай літаратурнай мовы;
- навыкамі выяўлення і інтэрпрэтацыі лексічных і граматычных адметнасцей тэкстаў усходнеславянскага, старабеларускага і пачатковых этапаў (XIX – пач. XX стст.) новага перыяду з улікам іх жанрава-стылістычнай прыналежнасці.

**Беларуская дыялекталогія**

*Літаратурная і дыялектная формы беларускай нацыянальнай мовы. Тэрытарыяльныя і сацыяльныя дыялекты, іх сучасны стан на Беларусі. Роля дыялектаў у фарміраванні сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Дыялектная фразеаграфія. Дыялекталагічны атлас беларускай мовы, лексічны атлас беларускіх народных гаворак.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***
- групоўку тэрытарыяльных дыялектаў;
- асноўныя паняцці (ізаглоса, пучок ізаглос, лінгвістычны арэал);
- асаблівасці развіцця дыялектаў у розных гістарычных умовах;
- асноўныя слоўнікі дыялектнай лексікі, матэрыялы дыялекталагічнага і лексічнага атласаў беларускай мовы;

***умець:***
- вызначаць фанетычныя, марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці народных гаворак;
- дыферэнцыраваць дыялектныя асаблівасці і літаратурныя нормы;
- вызначаць групоўку гаворак на карце Беларусі, складаць ізаглосы распаўсюджвання тых ці іншых дыялектных з'яў;

***валодаць:***
- практычнымі навыкамі выяўлення дыялектных асаблівасцей мовы жыхароў пэўнай мясцовасці;
- уменнямі пераадольваць арфаграфічныя і арфаэпічныя памылкі вучняў, звязаныя з уплывам дыялектнай мовы;

**Гісторыя беларускага мовазнаўства**

*Развіццё граматычнай думкі ва ўсходніх славян старажытнай пары. Нараджэнне параўнальна-гістарычнага мовазнаўства. Вывучэнне беларускай мовы ў XIX --пачатку XXI ст. Беларуская мова як аб'ект замежнай лінгвістыкі. Асноўныя напрамкі лінгвістычных даследаванняў. Працы па гісторыі беларускага мовазнаўства.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

***ведаць:***
- гісторыю развіцця граматычнай думкі ва ўсходніх славян старажытнай пары;
- асноўныя этапы і напрамкі гісторыі мовазнаўства;
- асноўныя працы вучоных, якія даследавалі пытанні беларускай мовы;
- бібліяграфічныя агляды і даследаванні айчынных і замежных лінгвістаў;

***умець:***
- карыстацца асноўнай і дадатковай літаратурай па дысцыпліне;
- вылучаць асноўныя перыяды гісторыі беларускага мовазнаўства, характарызаваць існаваўшыя ў розныя часы лінгвістычныя школы і напрамкі;
- прасачыць эвалюцыю навуковых ведаў, усвядоміць гэты працэс не як раўнамерны і прамалінейны рух да ісціны, але ўбачыць у ім уздымы і падзенні, перыяды паскоранага развіцця і застою;
- аналізаваць працы пра беларускую мову, створаныя на розных этапах развіцця беларускага мовазнаўства;
- супастаўляць пункты гледжання мовазнаўцаў, якія належалі да розных навуковых школ, на некаторыя агульныя і прыватныя праблемы беларускай лінгвістыкі;
- даваць кваліфікаваную ацэнку ролі і месца спадчыны канкрэтных лінгвістаў у даследаванні праблем беларускага мовазнаўства;

***валодаць:***
- найбольш важнымі паняццямі і тэрмінамі гісторыі лінгвістычнай навукі;

- гістарычным падыходам пры ацэнцы прац розных перыядаў, які дазваляе тлумачыць тую або іншую лінгвістычную працу як у кантэксце сваёй эпохі, так і з пункту гледжання сучасных навуковых ведаў;;
- навыкамі вядзення бібліяграфічнага пошуку ў сетцы internet, бібліятэчных зборах Беларусі і іншых краін;
- спосабамі складання бібліяграфіі прац па вызначанай тэматыцы.

**Гісторыя беларускай літаратуры**

*Гісторыка-культурны феномен даўняй беларускай літаратуры. Літаратура Сярэднявечча. Асаблівасці развіцця беларускай літаратуры эпохі Рэнесансу. Еўрапейскія традыцыі і нацыянальны каларыт беларускага Барока. Мастацкія напрамкі Асветніцтва. Мастацкія плыні ў беларускай літаратуры XIX ст.: сентыменталізм, перадрамантызм, рамантызм, рэалізм. Беларуская літаратура XI — XIX стст. і сусветны літаратурны працэс.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

- літаратурны працэс у сувязі з гісторыяй грамадства;
- праблематыку, ідэйны змест і вобразна-выяўленчыя сродкі ў літаратуры XI — XIX стст.;
- творчую гісторыю найбольш значных мастацкіх тэкстаў XI — XIX стст.;
- творчую спадчыну беларускіх пісьменнікаў XI — XIX стст.;
- нацыянальную спецыфіку беларускай літаратуры;
- агульначалавечае значэнне мастацкіх твораў;

***умець:***

- характарызаваць асаблівасці літаратурнага працэсу ў XI — XIX стст;
- аналізаваць творы з улікам іх ідэйна-мастацкай цэласнасці ў гісторыка-літаратурным кантэксце;
- характарызаваць літаратурныя напрамкі, плыні, жанры і стылі;
- выяўляць аб'ектыўныя заканамернасці і асаблівасці развіцця літаратурнага працэсу;
- сістэматызаваць і абагульняць фактычны матэрыял, які адлюстроўвае асаблівасці літаратуры розных гістарычных перыядаў;

***валодаць:***

- навуковай метадалогіяй, асноўнымі метадамі вывучэння літаратуры, рознымі прыёмамі інтэрпрэтацыі мастацкіх тэкстаў.

**Гісторыя беларускай літаратуры XX — пачатку XXI стст.**

*XX стагоддзе — асобная гісторыка-культурная эпоха, якая знаходзіць свае нацыянальныя праявы ў літаратуры Беларусі. Веліч класікі і значэнне эстэтычных традыцый, іх узаемадзеянне з авангарднымі плынямі на працягу ўсяго перыяду. Гісторыя літаратуры — гісторыя мастацкіх напрамкаў і плыняў, жанраў і стыляў. Жыццёвы шлях вядомых беларускіх пісьменнікаў, раскрыццё іх творчых індывідуальнасцей. Творчасць беларускіх аўтараў у інтэртэксце, у шырокім культурным кантэксце. Беларуская літаратура ў вертыкальных (у глыбіню архаікі, у міфалогію) і гарызантальных (з іншымі літаратурамі) сувязях. Асэнсаванне канцэпцыі асобы як цэнтральнай у беларускай мастацкай літаратуры. Выяўленне асаблівасцей нацыянальнага вобраза свету, беларускай ментальнасці, нацыянальнага характару. Сувязь фальклору і мастацкай літаратуры. Нацыянальныя архетыпы, феномены мастацкай свядомасці. Месца беларускай літаратуры ў свеце. Пераклады.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

- літаратурны працэс у сувязі з гісторыяй грамадства;
- спасціжэнне гісторыі літаратуры, яе ідэйна-эстэтычнага развіцця;
- творчасць буйных беларускіх пісьменнікаў;
- нацыянальную спецыфіку беларускай літаратуры;

***умець:***

- характарызаваць XX — пачатак XXI стагоддзяў як асаблівы перыяд у літаратуры;
- характарызаваць літаратурны напрамак, плынь, жанр;
- аналізаваць творчасць пісьменніка, заканамернасці літаратурнага развіцця;

***валодаць:***

- формамі і метадамі літаратуразнаўчага аналізу.

**Гісторыя замежнай літаратуры**

*Антычная літаратура. Заходнееўрапейская літаратура сярэдніх вякоў, Адраджэнне XVII-XVIII стагоддзяў. Замежная літаратура XIX-XX стагоддзяў. Сусветны літаратурны працэс на мяжы XX-XXI стагоддзяў. Дынаміка літаратурнага працэсу ў розныя гістарычныя эпохі. Асноўныя літаратурныя напрамкі, плыні, школы і літаратурныя групы. Традыцыя і наватарства. Творчы шлях класікаў нацыянальных літаратур. Літаратурныя маніфесты. Этапныя мастацкія тэксты: праблематыка і паэтыка. Спецыфіка перакладу на беларускую і рускую мовы. Сусветная літаратура ў беларускім культурным кантэксце.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

- галоўныя літаратурныя напрамкі, плыні, школы і стылі;
- літаратурныя жанры, сродкі мастацкай выразнасці;
- творчасць буйнейшых аўтараў, класікаў нацыянальных літаратур;
- этапныя мастацкія тэксты;
- найбольш значныя заканамернасці сусветнага літаратурнага працэсу.

***умець:***

- атрыбутаваць мастацкі тэкст з пункту гледжання эпохі яго стварэння, аўтарства, суаднесенасці з тым ці іншым літратурным напрамкам, цячэннем, школай, стылем;
- выяўляць і аналізаваць філасофскія, рэлігійныя, палітычныя і іншыя ідэі і канцэпцыі, якія знайшлі мастацкае ўвасабленне ў творах літаратуры;
- выяўляць і аналізаваць сродкі мастацкай выразнасці, якія выкарыстоўваюцца аўтарам пры стварэнні літаратурнага твора;

***валодаць:***

- методыкамі аналізу мастацкага тэксту;
- методыкай сістэматызацыі і структурывання з'яў літаратурнага працэсу.

**Методыка выкладання беларускай мовы**

*Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы (методыка выкладання беларускай мовы як навука, беларуская мова як вучэбны прадмет, падручнік і вучэбныя дапаможнікі па беларускай мове, прынцыпы, метады і прыёмы навучання беларускай мове, урок як асноўная форма навучання). Методыка навучання раздзелам беларускай мовы (методыка навучання фанетыцы, арфаэпіі, лексіцы і фразеалогіі, марфеміцы і словаўтварэнню, марфалогіі, сінтаксісу, арфаграфіі, пунктуацыі). Методыка развіцця маўлення (методыка навучання нормам стылістыкі і культуры маўлення, методыка ўзбагачэння слоўнікавага запасу і граматычнага ладу маўлення вучняў, методыка развіцця звязнага маўлення). Паглыбленае вывучэнне беларускай мовы.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

- тэарэтычныя асновы Канцэпцыі моўнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і канцэпцыі вучэбнага прадмета "Беларуская мова";
- заканамернасці ўзаемадзеяння выкладання беларускай мовы (дзейнасць настаўніка) і вучэння (дзейнасць вучня);
- сучасныя стратэгіі навучання беларускай мове, падыходы да арганізацыі навучання, яго сучасныя тэхналогіі;
- сутнасць працэсу навучання беларускай мове і ўмовы яго эфектыўнасці;
- мэты прадметнай адукацыі, прынцыпы адбору і структуравання вучэбнага матэрыялу, сродкі, метады і прыёмы навучання, формы і метады бягучага і выніковага кантролю;

- шляхі ўдасканалення арганізацыйных форм навучання беларускай мове, распрацоўкі новых навучальных сістэм і тэхналогій;

***умець:***

- творча падыходзіць да авалодання канцэпцыяй аўтараў сучасных падручнікаў па беларускай мове;
- аналізаваць сродкі навучання беларускай мове, вывучаць індывідуальныя асаблівасці вучняў; аналізаваць урокі; абгрунтоўваць выбар форм, метадаў, прыёмаў навучання; ацэньваць ход і вынікі навучальнай дзейнасці (гнастычныя уменні);
- прадумваць метадычную структуру ўрока, паслядоўнасць і спосабы работы над новым матэрыялам, яго замацаванне, абагульненне і сістэматызацыю; папярэджваць памылкі і недахопы маўлення вучняў; прадумваць формы, метады і прыёмы бягучага і выніковага кантролю (праекціровачныя ўменні);
- распрацоўваць канспекты ўрокаў беларускай мовы; адбіраць у адпаведнасці з мэтамі ўрока вучэбны матэрыял, метады, прыёмы; спецыяльныя сродкі навучання (канструктыўныя ўменні);
- паведамляць вучэбную інфармацыю; успрымаць адказы вучняў, тактоўна рэагаваць на іх выказванні і каменціраваць іх; валодаць прыёмамі выражэння ўпэўненасці ў магчымасцях вучняў;
- выконваць навукова-метадычную работу, удзельнічаць у працы навукова-метадычных аб'яднанняў;
- аналізаваць уласную дзейнасць з мэтай яе ўдасканалення і павышэння сваёй кваліфікацыі;

***валодаць здольнасцямі:***

- ажыццяўляць працэс навучання ў адпаведнасці з адукацыйнай праграмай;
- самастойна працаваць з навукова-метадычнай літаратурай;
- планаваць і праводзіць вучэбныя заняткі з улікам спецыфікі тэм і раздзелаў праграмы і ў адпаведнасці з вучэбным планам;
- выкарыстоўваць сучасныя навукова абгрунтаваныя прыёмы, метады і сродкі навучання, прымяняць тэхнічныя сродкі навучання, інфармацыйныя і камп'ютарныя тэхналогіі;
- прымяняць сучасныя сродкі ацэньвання вынікаў навучання;
- выхоўваць у навучэнцаў духоўныя і маральныя каштоўнасці, патрыятычныя перакананні на аснове індывідуальнага падыходу;
- арганізоўваць пазакласныя мерапрыемствы.

**Методыка выкладання беларускай літаратуры**

*Методыка выкладання беларускай літаратуры як навука. Выкладанне беларускай літаратуры ва ўстановах сярэдняй адукацыі (прынцыпы, змест і асноўныя этапы літаратурнай адукацыі). Шляхі развіцця методыкі беларускай літаратуры. Літаратурнае развіццё школьнікаў, фарміраванне літаратурных здольнасцей у вучняў рознага ўзросту. Метады выкладання літаратуры; асаблівасці ўрока беларускай літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Этапы вывучэння мастацкага твора; прыёмы аналізу літаратурнага твора; асаблівасці вывучэння на ўроку літаратуры мастацкіх твораў у іх жанравай спецыфіцы. Вывучэнне тэорыі літаратуры ў школьным курсе літаратуры; гісторыя літаратуры ў школьным вывучэнні. Развіццё мовы вучняў у працэсе літаратурнай адукацыі; літаратурная творчасць вучняў. Пазакласная і пазашкольная работа па беларускай літаратуры.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

- асаблівасці методыкі выкладання беларускай літаратуры як навуковай дысцыпліны, літаратуры ў шэрагу іншых мастацтваў і беларускай літаратуры як вучэбнага прадмета ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі;
- асноўныя этапы і шляхі развіцця методыкі выкладання беларускай літаратуры, агульныя заканамернасці гісторыка-літаратурнага працэсу;
- змест і структуру літаратурнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь;

- адметныя рысы літаратурнага развіцця вучняў, метады і прыёмы навучання літаратуры, этапы вывучэння мастацкага твора ў сучаснай сярэдняй школе;
- асновы вывучэння мастацкіх твораў у іх родавай і жанравай спецыфіцы, арганізацыі ўрока літаратуры;
- спецыфіку адлюстравання гісторыі і тэорыі літаратуры ў школьным навучанні, развіцця мовы вучняў у сістэме літаратурнай адукацыі, правядзення пазакласнай і пазашкольнай работы па літаратуры;

***умець:***

- вызначаць ролю і склад вучэбна-метадычных комплексаў у ажыццяўленні літаратурнай адукацыі ў сярэдняй школе;
- аналізаваць у гістарычным аспекце працы выдатных навукоўцаў-метадыстаў, бачыць ролю іх дзейнасці ў станаўленні методыкі выкладання беларускай літаратуры;
- характарызаваць змест, прынцыпы і прыёмы аналізу асноўных этапаў вывучэння мастацкага твора ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі;
- разумець і адлюстроўваць у практычнай дзейнасці спецыфіку родаў і жанраў мастацкіх твораў як неабходную ўмову іх паспяховага вывучэння;
- прадумана выкарыстоўваць у ходзе літаратурнай адукацыі належныя формы, метады, прыёмы, сродкі навучання;
- вызначаць месца і ролю тэарэтыка-літаратурных ведаў у структуры зместу навучання беларускай літаратуры;
- уяўляць і ажыццяўляць сістэму работы па развіцці пісьмовай мовы вучняў на другой і трэцяй ступенях адукацыі;
- суадносіць класнае і пазакласнае чытанне ў практыцы школьнага навучання;

***валодаць здольнасцямі:***

- ажыццяўляць працэс навучання ў адпаведнасці з адукацыйнай праграмай;
- самастойна працаваць з навукова-метадычнай літаратурай;
- планаваць і праводзіць вучэбныя заняткі з улікам спецыфікі тэм і раздзелаў праграмы і ў адпаведнасці з вучэбным планам;
- выкарыстоўваць сучасныя навукова абгрунтаваныя прыёмы, метады і сродкі навучання, ужываць тэхнічныя сродкі навучання, інфармацыйныя і камп'ютарныя тэхналогіі;
- прымяняць сучасныя сродкі ацэньвання вынікаў навучання;
- выхоўваць у навучэнцаў духоўныя і маральныя каштоўнасці, патрыятычныя перакананні на аснове індывідуальнага падыходу;
- арганізоўваць пазакласныя мерапрыемствы ў сувязі з выкладаннем беларускай літаратуры.

7.5.5. Змест вучэбных дысцыплін кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі і вучэбных дысцыплін цыклу спецыялізацый, а таксама патрабаванні да кампетэнцый па гэтых вучэбных дысцыплінах вызначаюцца вучэбнымі праграмамі ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбных дысцыплінах.

### 7.6 Патрабаванні да зместу і арганізацыі практык

Пры праходжанні практыкі фарміруюцца або развіваюцца кампетэнцыі, якія пазначаны ў табліцы 2 дадзенага адукацыйнага стандарту.

#### 7.6.1 Фальклорная практыка

Мэты фальклорнай практыкі – авалоданне першаснымі практычнымі ўменнямі прафесійнай дзейнасці, якая звязана са збіраннем фальклору. Практычная праца студэнтаў па збіранні фальклорных матэрыялаў паглыбляе і пашырае веды па фалькларыстыцы, атрыманыя на лекцыях і практычных занятках, знаёміць з жывым бытаваннем вуснай народнай творчасці, дазваляе непасрэдна сустрэцца з выканаўцамі фальклорных твораў і набыць навыкі збіральніцкай дзейнасці.

**7.6.2 Дыялекталагічная практыка**

Мэты дыялекталагічнай практыкі – замацаванне тэарэтычных ведаў па курсе "Беларуская дыялекталогія" ў працэсе запісу і аналізу дыялектнага матэрыялу (тэрытарыяльных і сацыяльных дыялектаў), набыццё студэнтамі навыкаў палявой работы, іх "ужыўленне" ў дыялектную стыхію, збор і апрацоўка дыялектнага матэрыялу для наступнага паглыбленага лінгвістычнага аналізу.

**7.6.3 Літаратурна-рэдакцыйная практыка (напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-01 Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць))**

Практыка дазволіць пазнаёміць студэнтаў са спецыфікай арганізацыі працоўнага працэсу ў выдавецтвах рознага профілю і ўласнасці, перыядычных выданнях рознага профілю, сродках масавай інфармацыі (радыё, тэлебачанне і інш.), методыкай рэдактарскай справы, тыпалогіяй выданняў, відамі тэкстаў і асаблівасцямі працы з імі.

**7.6.4 Камп'ютарнае забеспячэнне філалагічнай дзейнасці (вытворчая практыка) (напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-02 Беларуская філалогія (камп'ютарное забеспячэнне))**

Мэта гэтай практыкі – пазнаёміць студэнтаў са спецыфікай камп'ютарнага забеспячэння розных відаў дзейнасці філолага, замацаваць уменні і навыкі вырашэння прафесійных задач з прыцягненнем тэхналогій, метадаў і інструментальных сродкаў камп'ютарнай лінгвістыкі, уключаючы камп'ютарную (электронную) лінгвадыдактыку.

**7.6.5 Камунікатыўна-дзелавая практыка (напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-03 Беларуская філалогія (дзелавая камунікацыя))**

Практыка дазволіць пазнаёміць студэнтаў са спецыфікай рабочага працэсу на перадавых прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях рознага профілю, сродках масавай інфармацыі (радыё, тэлебачанне і інш.), методыкай працы з дзелавой дакументацыяй, вядзенне прафесійна арыентаванага дыялогу, дзелавой палемікі, перамоў.

**7.6.6 Пераддыпломная практыка**

Мэты пераддыпломнай практыкі:

- азнаямленне з вучэбнай і выхаваўчай працай установы адукацыі;
- назіранне за вучэбным калектывам, вывучэнне асобы навучэнца;
- правядзенне вучэбнай працы ў якасці настаўніка адпаведнага прадмета;
- правядзенне выхаваўчай і культурна-творчай працы ў якасці класнага кіраўніка;
- правядзенне навукова-даследчай працы па псіхолага-педагагічных праблемах;
- удзел у метадычнай працы ўстановы адукацыі;
- ацэнка прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў, набытых пад час праходжання педагагічнай практыкі.

У выніку прахождання педагагічнай (пераддыпломнай) практыкі навучэнец павінен:

1) замацаваць і ўдасканаліць веды, атрыманыя ў выніку вывучэння лінгвістычных, літаратуразнаўчых і псіхолага-педагагічных дысцыплін;

2) авалодаць асноўнымі прафесійнымі ўменнямі настаўніка-прадметніка і класнага кіраўніка.

# 8 Патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу

## 8.1 Патрабаванні да кадравага забеспячэння адукацыйнага працэсу

Педагагічныя кадры ўстановы вышэйшай адукацыі павінны:

– мець вышэйшую адукацыю, якая адпавядае профілю выкладаемых вучэбных дысцыплін і, як правіла, адпаведную навуковую кваліфікацыю (вучоную ступень і (або) вучонае званне);

– займацца навуковай і (або) навукова-метадычнай дзейнасцю;

– не радзей за адзін раз на 5 гадоў праходзіць павышэнне кваліфікацыі;

– валодаць сучаснымі адукацыйнымі, у тым ліку інфармацыйнымі тэхналогіямі, неабходнымі для арганізацыі адукацыйнага працэсу на належным узроўні;

– валодаць асобаснымі якасцямі і кампетэнцыямі, якія дазваляюць эфектыўна арганізоўваць вучэбную і выхаваўчую работу са студэнтамі.

**8.2 Патрабаванні да матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння адукацыйнага працэсу**

Установа вышэйшай адукацыі павінна валодаць:

– матэрыяльна-тэхнічнай базай, неабходнай для арганізацыі адукацыйнага працэсу, самастойнай работы і развіцця асобы студэнта;

– сродкамі навучання, неабходнымі для рэалізацыі адукацыйных праграм па спецыяльнасці 1 – 21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках) (прылады, абсталяванне, інструменты, вучэбна-наглядныя дапаможнікі, камп’ютары, камп’ютарныя сеткі, аўдыявізуальныя сродкі і іншыя матэрыяльныя аб’екты).

**8.3 Патрабаванні да навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу**

Навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу павінна адпавядаць наступным патрабаванням:

– дысцыпліны вучэбнага плану павінны быць забяспечаны сучаснай вучэбнай, даведачнай, іншай літаратурай, вучэбнымі праграмамі, вучэбна-метадычнай дакументацыяй, вучэбна-метадычнымі, інфармацыйна-аналітычнымі матэрыяламі;

– павінен быць забяспечаны доступ для кожнага студэнта да бібліятэчных фондаў, электронных сродкаў навучання, электронных інфармацыйных рэсурсаў (лакальнага доступу, аддаленага доступу) па ўсіх вучэбных дысцыплінах.

Навукова-метадычнае забеспячэнне павінна быць арыентавана на распрацоўку і ўкараненне ў адукацыйны працэс інавацыйных адукацыйных тэхналогій, адэкватных кампетэнтнаснаму падыходу (варыятыўных мадэлей самастойнай работы, модульных і рэйтынгавых сістэм навучання, тэставых і іншых сістэм ацэнкі ўзроўню кампетэнцый і да т. п.).

**8.4 Патрабаванні да арганізацыі самастойнай работы студэнтаў**

Патрабаванні да арганізацыі самастойнай работы вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**8.5 Патрабаванні да арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы**

Патрабаванні да арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы вызначаюцца ў адпаведнасці з рэкамендацыямі па арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўстановах вышэйшай адукацыі і праграмна-планавай дакументацыяй выхавання.

**8.6 Агульныя патрабаванні да формаў і сродкаў дыягностыкі кампетэнцый**

8.6.1 Канкрэтныя формы і працэдуры прамежкавага кантролю ведаў навучэнцаў па кожнай вучэбнай дысцыпліне распрацоўваюцца адпаведнай кафедрай установы вышэйшай адукацыі і замацоўваюцца ў вучэбных праграмах установы вышэйшай адукацыі па вучэбных дысцыплінах.

8.6.2 Для атэстацыі навучэнцаў на адпаведнасць іх персанальных дасягненняў паэтапным або канчатковым патрабаванням адпаведнай адукацыйнай праграмы ствараюцца фонды ацэначных сродкаў, якія ўключаюць тыпавыя заданні, кантрольныя работы, тэсты, комплексныя кваліфікацыйныя заданні, тэматыку курсавых работ, тэматыку рэфератаў, канкрэтныя метадычныя распрацоўкі па інавацыйных формах навучання і кантролю за фарміраваннем кампетэнцый, тэматыку і прынцыпы напісання эсэ, формы анкет для правядзення самаацэнкі кампетэнцый навучэнцаў і інш. Фонды ацэначных сродкаў распрацоўваюцца адпаведнымі кафедрамі ўстановы вышэйшай адукацыі.

У ацэначных сродках павінна прадугледжвацца ацэнка здольнасці навучэнцаў да творчай дзейнасці, іх падрыхтоўкі праводзіць пошук вырашэння новых задач, звязаных з недастатковасцю канкрэтных спецыяльных ведаў і адсутнасцю агульнапрынятых алгарытмаў.

8.6.3 Для дыягностыкі кампетэнцый выкарыстоўваюцца наступныя формы:

1. Вусная форма.

2. Пісьмовыя формы.
3. Вусна-пісьмовыя формы.
4. Тэхнічныя формы.

Да вуснай формы дыягнаставання кампетэнцый адносяцца:
1. Гутаркі.
2. Калёквіумы.
3. Даклады на семінарскіх занятках.
4. Даклады на канферэнцыях.
5. Вусныя залікі.
6. Вусныя экзамены.
7. Ацэньванне на аснове дзелавой гульні.
8. Тэсты дзеяння.
9. Іншыя.

Да пісьмовай формы дыягнаставання кампетэнцый адносяцца:
1. Тэсты.
2. Кантрольныя апытанні.
3. Кантрольныя работы.
4. Пісьмовыя справаздачы па аўдыторных (дамашніх) практычных практыкаваннях.
5. Пісьмовыя справаздачы па лабараторных работах.
6. Эсэ.
7. Рэфераты.
8. Курсавыя работы.
9. Справаздачы па навукова-даследчай рабоце.
10. Публікацыі артыкулаў, дакладаў.
11. Заяўкі на вынаходніцтвы і карысныя мадэлі.
12. Пісьмовыя залікі.
13. Пісьмовыя экзамены.
14. Стандартызаваныя тэсты.
15. Ацэньванне на аснове модульна-рэйтынгавай сістэмы.
16. Ацэньванне на аснове кейс-метаду.
17. Ацэньванне на аснове партфоліа.
18. Ацэньванне на аснове метаду развітой кааперацыі.
19. Ацэньванне на аснове праектнага метаду.
20. Ацэньванне на аснове дзелавой гульні.
21. Іншыя.

Да вусна-пісьмовых формаў дыягнаставання кампетэнцый адносяцца:
1. Справаздачы па аўдыторных практычных практыкаваннях з іх вуснай абаронай.
2. Справаздачы па дамашніх практычных практыкаваннях з іх вуснай абаронай.
3. Справаздачы па лабараторных работах з іх вуснай абаронай.
4. Курсавыя работы з іх вуснай абаронай.
5. Залікі.
6. Экзамены.
7. Абарона дыпломнай работы.
8. Узаемнае рэцэнзаванне студэнтамі дыпломных работ.
9. Ацэньванне на аснове модульна-рэйтынгавай сістэмы.
10. Ацэньванне на аснове метаду развітой кааперацыі.
11. Ацэньванне на аснове праектнага метаду.
12. Ацэньванне на аснове дзелавой гульні.
13. Ацэньванне на аснове метаду Дэльфі.
14. Іншыя.

Да тэхнічнай формы дыягнаставання кампетэнцый адносяцца:
1. Электронныя тэсты.
2. Электронныя практыкумы.

3. Візуальныя лабараторныя работы.
4. Іншыя.

## 9 Патрабаванні да выніковай атэстацыі

### 9.1 Агульныя патрабаванні

9.1.1 Выніковая атэстацыя ажыццяўляецца дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіяй.

9.1.2 Да выніковай атэстацыі дапускаюцца студэнты, якія поўнасцю выканалі вучэбны план і вучэбныя праграмы.

9.1.3 Выніковая атэстацыя студэнтаў пры засваенні адукацыйных праграм па спецыяльнасці 1-21 05 01 "Беларуская філалогія (па напрамках)" праводзіцца ў форме дзяржаўнага экзамену па спецыяльнасці, напрамку спецыяльнасці, спецыялізацыі і абароны дыпломнай работы.

9.1.4 Пры падрыхтоўцы да выніковай атэстацыі фарміруюцца або развіваюцца кампетэнцыі, прыведзеныя ў табліцы 2 дадзенага адукацыйнага стандарту.

### 9.2 Патрабаванні да дзяржаўнага экзамену

Дзяржаўны экзамен праводзіцца на пасяджэнні дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі.

Праграма дзяржаўнага экзамену распрацоўваецца ўстановай вышэйшай адукацыі ў адпаведнасці з Правіламі правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі.

### 9.3 Патрабаванні да дыпломнай работы

Патрабаванні да структуры, зместу, аб'ёму і парадку абароны дыпломнай работы вызначаюцца ўстановай вышэйшай адукацыі на падставе дадзенага адукацыйнага стандарту і Правілаў правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі.

## Дадатак
(інфармацыйны)

## Бібліяграфія

[1] Кодекс Республики Беларусь об образовании, 13 янв. 2011 г., № 243-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2011. – № 13. – 2/1795.

[2] Государственная программа развития высшего образования на 2011-2015 гг.: постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 1 июля 2011 г., № 893 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2011. – № 79. – 5/34104.

[3] Общегосударственный классификатор Республики Беларусь. Специальности и квалификации: ОКРБ 011-2009. – Введ. 01.07.09. – Минск: М-во образования Респ. Беларусь: РИВШ, 2009. – 418 с.

[4] Образовательный стандарт Республики Беларусь. Высшее образование. Первая ступень. Специальность 1-21 05 01 Белорусская филология (по направлениям): ОСРБ 1-21 05 01-2009.- Введ. 01.09.09. – Минск: М-во образования Респ. Беларусь: РИВШ, 2008. – 44 с.

[5] Образовательный стандарт Республики Беларусь. Высшее образование. Первая ступень. Специальность 1-21 05 01-2009 Белорусская филология (по направлениям). Направление 1-21 05 01-03 Белорусская филология (деловая коммуникация): ОСРБ 1-21 05 01-03.- Введ. 01.09.08.-Минск: М-во образования Респ. Беларусь: РИВШ, 2008. – 36 с.